Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕТСКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНАЙ АРМІІ
(ЦВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР)

ПЯТНІЦА
31 ліпеня 1931 г.
№ 174 (3263)

Алма-Ата, Ленина 81
Гос.Публичная Библиотека
Февр-Зіг.-янв-32г. /С.Б.І./

Усе сілы, усе сродкі на ўборку лёну і канапель!

Па БССР зараз разгарнулася масавая ўборачная кампанія азімін. Мы ўступілі ў самую гарачую, самую адказную пару рэалізацыі ўраджаю другой бальшавіцкай вясны.

Але ці можам мы сказаць, што ў гэту кампанію адпаведныя арганізацыі ўступілі па-бальшавіцку, працуюць бальшавіцкімі тэмпамі, улічваючы, што гэта кампанія зьяўляецца важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй, што гэта кампанія—бальшавіцкі экзамен для ўсіх мясцовых партыйных, камсамольскіх, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, для ўсіх рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Нажаль, гэтага сказаць нельга. Нажаль, дзесьці-дзе ня толькі неадчуваюцца бальшавіцкія тэмпы, але маецца апартуністычная стаўка на самацёк, нядбайнасьць, работа з халаднком.

У нашай газэце мы падавалі цэлы рад такіх адстаючых раёнаў, сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў. Мы зазначалі на тое, што нездавальняюча праходзіць сенаўборка, што зрываецца зусім сіласаваньне, што, такім чынам, маецца пагроза забясьпечаньня кармовай базы жывёлагадоўлі, якая разам з тэхнічнымі культурамі зьяўляецца вядучай галінай сельскае гаспадаркі БССР. Мы адзначалі, што недапушчальна слабыя тэмпы барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне зьдзельшчыны, што зусім недастаткова праводзіцца вучот працы ў калгасах, што чарапашымі тэмпамі ідзе ўчэньне працоўных кніжок калгасьнікам, што слаба зусім вядзецца барацьба з кулацкай ураўнілаўкай у калгасах.

Уборка натуральных сенажацяй павінна быць скончана да 5-га жніўня, а мы яшчэ далёка адсталі зд 100-процантнага выкананьня гэтага тэрміну ўборкі. Да 5-га жніўня ў паўднёвай і сярэдняй паласе БССР павінна быць скончана ўборка азімых, да 10-га жніўня павінна быць скончана ўборка ў паўночнай зоне. Але, як мы казалі вышэй, ня ўсе раёны забясьпечылі такія тэмпы, якія-б давалі магчымасьць сказаць, што гэта будзе выканана цалкам і ў тэрмін.

Падкрэсьліваючы яшчэ і яшчэ раз неабходнасьць сканцэнтраваць усе сілы партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на важнейшых, галоўнейшых мерапрыемствах, якія забясьпечваюць посьпехі ўборачнай—гэта значыць поўнае і няўхільнае ўвядзеньне зьдзельшчыны ва ўсіх без выключэньня саўгасах і калгасах, своячасовае выяўленьне і разьмеркаваньне рабочай сілы, за вучот працы ў калгасах, за неадкладнае ўручэньне калгасьнікам працоўных кніжок, за далейшы магутны прыліў у калгасы, за няўхільную барацьбу за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва як клясы, падкрэсьліваючы ўсё гэта з усёй сілай неабходна зараз адначасова з гэтым асаблівую ўвагу, усе намаганьні накіраваць на ўборку лёну і канапель.

БССР у гэтым годзе мае вялікія посьпехі ў выкананьні і перавыкананьні плянаў засеву лёну і канапель. БССР якая засеяла 250.000 га лёну і канапель, тым самым стала на чацьвёртае месца па сяўбе тэхнічных культур пасьля Заходняй вобласьці, Ніжагародзкага краю і Ленінградзкай вобласьці.

Цэнтральны камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове даў такую дырэктыву: «Уборку лёну ў паўднёвай зоне скончыць да 25-га жніўня, у сярэдняй зоне—да 30 жніўня, і ў паўночнай зоне—да 5-га верасьня».

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў: «Прапанаваць усім цэнтральным і мясцовым савецкім і гаспадарчым арганізацыям зьвярнуць асаблівую ўвагу як на ўборку, так і першачарговую апрацоўку тэхнічных культур—лёну і канапель, плошча засеву якіх ў гэтым годзе значна павырана. У паасобку ўжыць самыя рашучыя захады да своячасовага сканчэньня будаўніцтва заводаў па першапачатковай апрацоўцы паказаных культур. Адзначыць, што будаўніцтва гэтых заводаў у сучасны момант праходзіць нездавальняюча».

Гэтыя дырэктывы партыі і ўраду павінны быць цалкам і ў тэрмін выкананы безагаворачна.

Што для гэтага трэба зрабіць зараз-жа, ня трацячы наводнай хвіліны?

Для гэтага трэба безадкладна распрацаваць пляны ўборкі лёну і канапель, спусьціць гэтыя пляны ў кожны калгас, саўгас і вёску; для гэтага трэба самым дэталёвым чынам распрацаваць пытаньні аб правільнай расстаноўцы сіл, аб поўным укараненьні зьдзельшчыны ва ўсе працэсы ўборкі лёну і канапель, аб ручэньні кожнаму калгасьніку працоўных кніжок; для гэтага патрэбна разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва ва ўборцы як збожжавых, так і асабліва тэхнічных культур, для гэтага патрэбна разгарнуць уборачную эстафэту саветаў, у якую ўключылася яшчэ да гэтага часу вельмі мала сельсаветаў БССР.

Гэтыя задачы—баявыя задачы ўборачнай кампаніі наогул, уборкі ўраджаю лёну і канапель у асаблівасьці. Для таго, каб з імі справіцца пасьпяхова, а гэтага рашуча патрабуюць партыя і ўрад, для гэтага неабходна вялікая прадуманасьць, дакладная пад рыхтоўка і шырачэйшая мабілізацыя ўсіх сіл, усіх сродкаў, усіх магчымасьцяй, усёй волі. І толькі пры гэтых умовах, толькі пры ўмовах самай рашучай зьнішчальнай барацьбы з правымі правага і «левага» апартунізму, з усякімі спробамі азьвярэлага кулацтва затармазіць, сарваць, разбурыць пляны пасьпяховай уборкі ўраджаю нзогул, лёну і канапель, як вядучай галіны сельскай гаспадаркі БССР у асаблівасьці, мы даб'ёмся пасьпяховага прэзэдзеньня ўборкі лёну і канапель.

Стаўка на апартуністычны самацёк, «тэорыя» чарговасьці кампаній, усякія праявы апартуністычнай бязрукасьці, якія мелі месца ў мінулым годзе ў практыцы некаторых мясцовых арганізацый БССР, павінны быць зжыты самым рашучым чынам.

Ні на адну хвіліну ня трэба забываць аб тым, што БССР, якая займае чацьвёртае месца ў СССР па ляўчы пасеву лёну і канапель, што БССР павінна даць вельмі значны ўклад як у забясьпечаньне тэкстыльнай прамысловасьці сыравінай, сплаву і пуціны—пяньковымі вырабамі, што БССР таму павінна ўсю работу па ўборцы лёну і канапель прэзэдзь духам баль шавіцкай энэргіі, арганізаванасьці, бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам—кулацтвам і яго агентурай правым і «левым» апартунізмам.

Партыйныя, камсамольскія, савецкія і грамадзкія арганізацыі, актыў калгасаў і вёсак павінны зараз-жа бяз хвіліны маруднасьці ажыцьцявіць паварот тварам да ўборкі ўраджаю наогул, тварам да ўборкі тэхнічных культур ў асаблівасьці, яны павінны зараз-жа арганізаваць найлепшую расстаноўку брыгад, забясьпечыць найлепшую работу ўнутры брыгад, найлепшым чынам арганізаваць асаблівыя вытворчыя працэсы, абмеркаваць нормы выпрацоўкі для кожнага віду работы, правільна расставіць сілы на ўсе вучасткі работы і па-сапраўднаму, па-бальшавіцку стаць арганізатарамі сацспаборніцтва на вышэйшыя нормы выпрацоўкі, на лепшае скарыстаньне цягавай сілы і машын, на правядзеньне ўборкі ўраджаю, асабліва лёну і канапель з мінімальнымі стратамі.

Леташнія памылкі ўборачнай лёну і канапель не павінны паўтарацца ні ў якай ступені. Ганьбой пакрыць сябе той раён, сельсавет, калгас, саўгас, вёска, у якіх застанецца хоць адзін га няўбранага і неапрацаванага лёну і канапель.

За поўную і ў тэрмін уборку лёну і канапель, за поўную яго і дабраякасную апрацоўку, за пабудову усіх першапачатковых лёнапрацоўчых заводаў, за пасьпяховае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду—павінна пабальшавіцку змагацца кожная мясцовая партыйная арганізацыя, кожны РВК, кожны сельсавет, кожны калгас, саўгас, МТС, вёска, кожны паасобны партыец, камсамолец піянэр, рабочы, калгасьнік, бядняк і серадняк.

Усе сілы, усе сродкі, усю энэргію на арганізацыю бальшавіцкай уборкі лёну і канапель!

Саветы, на барацьбу за выкананьне фінпляну!

Беларуская ССР дасягнула значных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Гэтыя посьпехі сапраўды забясьпечаюць ператварэньне нашай рэспублікі з аграрнай у краіну індустрыяльна-калгасную. БССР стала цьвёрда на шлях калектывізацыі, на шлях арганізацыі буйных савецкіх гаспадарак і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Вялікія посьпехі, якія маюцца на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, атрыманы ў выніку рашучага пераможнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце, зламаўшы супраціўленьне клясавых ворагаў—непманаў, кулацтва, шкоднікаў, нацдэмаў і інш. агентаў міжнароднай буржуазіі. На падставе правільнага правядзеньня ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, рашучага змаганьня супроць правых і «левых» апартуністаў, гэтыя посьпехі замацоўваюцца і БССР шпаркімі тэмпамі будуе соцыялізм.

Праграма сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаная ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, патрабуе напружанай работы ўсіх органаў, усіх арганізацый. Саветы і выканкомы павінны стаць сапраўды на чале разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, змагацца за ажыцьцяўленьне вызначаных плянаў, у першую чаргу, шляхам дакладнага выкананьня фінпляну.

Але яшчэ да гэтага часу ў гэтай галіне работы мы маем нездавальняючае становішча. Барацьба за фінплян яшчэ не стала ў цэнтры ўвагі штодзённай работы выканаўчых камітэтаў і саветаў. Да гэтага часу яшчэ адсутнічае сыстэматычны нагляд за ходам выкананьня фінпляну. Плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў штодзённай практыцы саветаў і выканаўчых камітэтаў часта адрываецца ад іншых гаспадарчых кампаній. Гэта трэба тлумачыць, як вынік нездавальняючага пастаўленай масава-агітацыйнай растлумачальнай работы сярод шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў. Саветы, і выканаўчыя камітэты не растлумачваюць шырокім масам вялізарнага значэньня дакладнага выкананьня фінпляну. Выпрабаваньня мэтады сацыялістычнай працы—сацспаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі, сельсаветамі, прадпрыемствамі, ударніцтва яшчэ не знайшлі належнага пашырэньня ажыцьцяўленьня. Таксама на выкананьне фінпляну не зварочае належнай увагі і мясцовы друк. Сэкцыі саветаў і дэпутацкія групы на прадпрыемствах барацьбу за фінплян яшчэ не зрабілі адпай з асноўных задач у сваёй рабоце. Грамадзкасьць слаба ўцягнута ў справу выкананьня фінпляну. Вельмі слаба яшчэ працуюць камітэты садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры саветах і выканаўчых камітэтах. Гэта сьведчыць аб тым, што вакол баявых задач фінансавага пляну саветы і ў прыватнасьці фінорганы не мабілізавалі ўвагу шырокай пралетарскай грамадзкасьці.

Ажыцьцяўляючы фінплян, трэба аба вязкова дыфэрэнцыраваць кіраўніцтва раёнаў і сельсаветаў у галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Гэтага да сучаснага моманту яшчэ няма. Барацьба за фінплян павінна быць перакінута непасрэдна ў цэхі, у саўгасы, калгасы, машына-трактарныя станцыі і г. д. Такія мэтады работы далі-б ужо да гэтага часу значныя вынікі.

Саветы і выканаўчыя камітэты, абапіраючыся на энтузіязм мільённых мас працоўных, павінны выканаць плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва і тым самым забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі. Гэта зьяўляецца неабходнай умовай пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва. Мабілізацыя сродкаў насельніцтва паавіна стаць адной з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, як гэта адзначыў Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР па спэцыяльным дакладзе Прэзыдыуму ЦВК БССР аб рабоце саветаў па ажыцьцяўленьні фінансавай палітыкі і мабілізацыі сродкаў насельніцтва. У БССР, (у прыватнасьці, у фінорганах), да гэтага часу наглядалася апартуністычная стаўка на самацёк і не скарыстоўваліся мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не дастаткова зварочалася ўвага на пытаньне ўзмацненьня фінорганаў аўтарытэтнымі кваліфікаванымі клясавытрыманымі працаўнікамі.

У першым і ў другім квартале гэтага году ў справе выкананьня фінпляну былі прарывы. Гэтыя прарывы могуць пацягнуць за сабою сур'ёзныя перашкоды ў справе фінасаваньня капітальнага будаўніцтва БССР. Тыя недахопы, якія ў галіне выкананьня фінпляну ў БССР наглядаліся да гэтага часу, павінны быць зараз рашуча зьнішчаны і работа саветаў і выканаўчых камітэтаў павінна забясьпечыць поўнае выкананьне ўсімі, бяз выключэньня савецкімі і гаспадарчымі органамі ўскладзеных на іх абавязкаў. Яны павінны забясьпечыць ажыцьцяўленьне плянаў мабілізацыі сродкаў насельніцтва на тэрыторыі БССР цалкам.

Што неабходна зрабіць для таго, каб зьнішчыць усе тыя недахопы, якія меліся ў рабоце саветаў і выканаўчых камітэтаў у галіне дакладнага і своячасовага выкананьня фінпляну? Перш за ўсё трэба ўзмацніць масавую работу сярод працоўных, у прыватнасьці, трэба **шырока растлумачыць працоўным вялізарнае значэньне пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі** і ўмовы яе выпуску. На сходах у калгасах, у вёсцы неабходна ўжыць усе захады да зруйнавальнага адпору кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў фінпляну. Саветы павінны забясьпечыць поўнае скарыстаньне шэфскіх арганізацый для агітацыйна-растлумачальнай работы нашай фінансавай палітыкі. У горадзе мы маем вялікія посьпехі ў справе рэалізацыі пазыкі. Гэта трэба тлумачыць у першую чаргу вялізарнай сьвядомасьцю працоўных і добрай арганізацыяй савецкай грамадзкасьці. Іншае становішча мы маем ў вёсцы.

Таму неабходна ўвесь вопыт масавай работы саветаў у горадзе перанесьці ў вёску. Трэба саветам і выканаўчым камітэтам скарыстаць сэкцыі і камсоды для выкананьня тых кантрольных лічбаў, якія яны атрымалі. У гэтай справе горад павінен **тва перашкаджае іншым гаспадарчым і палітычным кампаніям павінна быць рашуча выкарчавана.** Такімі тлумачэньнямі часта прыкрываюцца апартуністычныя спробы сарваць выкананьне фінпляну. Мабілізацыя сродкаў насельніцтва павінна быць шчыльна і не парыўна ўвязана з іншымі гаспадарчымі і палітычнымі кампаніямі.

Гаворачы аб выкананьні фінпляну, неабходна памятаць і тое, што фінансавая работа сельсаветаў павінна быць значна палепшана. Бюджэты сельсаветаў павінны быць узмоцнены. Райвыканкомы павінны дапамагчы сельсаветам зрабіцца сапраўднымі гаспадарамі сельскіх бюджэтаў. У тэй-жа час сельсаветы павінны несьці поўную адказнасьць за выкананьне адзінага фінансавага пляну на вёсцы.

Дакладна выкананьне саветамі і выканаўчымі камітэтамі, усімі савецкімі органамі і грамадзкімі арганізацыямі ўскладзеных на іх задач у галіне выкананьня фінпляну дасьць магчымасьць палепшыць бытавое і культурнае абслугоўваньне рабочых мас дасьць магчымасьць разгарнуць яшчэ больш індустрыялізацыю нашае краіны і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Дакладнае выкананьне фінпляну дасьць магчымасьць ня толькі захаваць сучасныя шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, але і паскорыць іх. Саветы і выканаўчыя камітэты павінны штодзенна сапраўды па бальшавіцку змагацца за выкананьне фінпляну.

М. Гнілякевіч.

Буржуазія рыхтуецца

ЗАТАПІЦЬ У КРЫВІ ДЭМАНСТРАЦЫЮ ПРАЦОЎНЫХ МАС У ДЗЕНЬ 1 ЖНІЎНЯ

Пралетарыят будзе дэманстраваць пад сьцягам камуністычнай партыі сваю непахісную гатоўнасьць да барацьбы супроць імпэрыялістычных войн, у абарону СССР

Паліцыя напагатове

ВІЛЬНЯ, 29-7. Польскі друк пястрыць паведамленьнямі аб масавых аблавах і арыштах ва ўсіх гарадох, па мястэчках і вёсках Польшчы. «Паліцыя на пагатове»—пад такім загалоўкам дэфэнзыўны орган «Кур'ер Ілюстраваны» прабалтвае аб мерапрыемствах фашысцкага ўраду. Міністэрства ўнутраных спраў выдала спэцыяльны загад, згодна якога ўсе паліцэйскія прыведзены ў баявую гатоўнасьць.

Варшава, Лодзь, Домброўскі басэйн і іншыя прамысловыя цэнтры разьбіты на спэцыяльныя раёны і вызначаны ка мэнданты, якім нададзены паўнамоцтвы «ліквідаваць усякае выступленьне, усякую спробу дэманстрацыі ў зародку». Апроч таго, вылучаны спэцыяльныя хэмічныя паліцэйскія дружыны, якія маюць кідаць газавыя і сьлёзатачывыя бомбы.

Але як відаць, фашысцкі ўрад ня мае поўнай упэўненасьці ў тым, што паліцыі ўдасца не дапусьціць да выступленьняў пралетарыяту і працоўных мас Польшчы ў дзень 1-га жніўня і праводзіць папярэднія масавыя аблавы і арышты.

У ВАРШАВЕ з 25-га г. м. штодня паліцыя арыштоўвае западозраных у камунізьме рабочых. За адну толькі ноч, з 27-га на 28-га, арыштавана звыш 100 чалавек рабочых. Ня толькі вастрогі і арыштныя дамы перапоўнены арыштаванымі, але і сутарэньні паліцыі і магістрату.

Увесь буржуазны друк піша, што ня гледзячы на «энэргічныя мерапрыемствы» улады, камуністы распачнулі надзвычайна вялікую кампанію і праяўляюць вялікую актыўнасьць у падрыхтоўцы да дня 1-га жніўня. На радзе фабрык, заводаў адбываюцца масоўкі. Прамоўцы выкрываюць палітыку фашысцкага ўраду, які рыхтуецца да ўзброенага нападу на СССР. Рабочыя заяўляюць, што яны не дадуць сябе ашукаць ні сацыял-фашыстам, ні дыктатару Пілсудзкаму. Рабочыя выступяць у абарону СССР.

На сходах і мітынгах беспрацоўных выносяцца рэзалюцыі, што фашысцкі ўрад траціць мільёны на ўзброеньне і ні граша на дапамогу галадаючым-беспрацоўным. Беспрацоўныя патрабуюць скасаваць ваенны бюджэт і ўсе сродкі з гэтага бюджэту перадаць беспрацоўным.

У ЛОДЗІ рабочыя наладжваюць мітынгі-масоўкі, на якіх выказваюцца супроць імпэрыялістычнай палітыкі фашысцкага ўраду, патрабуюць скасаваньня ваеннага бюджэту і заяўляюць, што калі фашысцкі ўрад адважыцца на ваенную авантуру—ўзброены напад на СССР, дык рабочыя здабудуць зброю каб зьнішчыць сапраўднага ворага—«сваю» буржуазію.

Па ўсім горадзе распаўсюджваецца шмат адозваў камуністычнай партыі, на тэлефонных і на трамвайных праводох вывешваюцца чырвоныя сьцягі, на сьценах фарбамі напісаны антываенныя лёзунгі. Паліцыя ўчыняе шмат лікія арышты сярод западозраных у камуністычнай дзейнасьці.

У БЕЛАСТОКУ паліцыя ўчыніла аблавы, у выніку якой арыштавана звыш 25 чалавек. Дэфэнзыва распаўсюджвае хлусьню аб тым, што нібы-та арыштаваныя падрыхтоўваліся да выступленьня ў дзень 1-га жніўня, з тым, каб выклікаць «крывавыя бойкі». Арыштаваных »закутых па руках і нагах адвезьлі ў вастрог.

У ВІЛЬНІ камуністы распаўсюджваюць шмат літэратуры і праяўляюць надзвычайна вялікую актыўнасьць. Так, былі вывешаны чырвоныя сьцягі на вуліцах Шаптыцкага, а таксама на іншых вуліцах. Апроч таго, паліцыі ўдалося арыштаваць двух рабочых, якія рыхтаваліся вывесьці чырвоны сьцяг на рэпрэзэнтацыйным палацы. «На шчасьце гэта ім не ўдалося»,— з задаволеньнем піша «Кур'ер Віленскі».

У часе арышту гэтых двух рабочых, сабраўся вялікі натоўп, які імкнуўся адбіць арыштаваных. Толькі дзякуючы таму, што падасьпеў вялікі атрад паліцыі, удалося затрымаць арыштаваных, прычым паліцыя арыштавала яшчэ некалькі рабочых з натоўпу.

Арышты адбываюцца таксама і па вёсках, як у Польшчы, Заходняй Украіне, так і ў Заходняй Беларусі. Аднак, ня гледзячы на ўсе мерапрыемствы ўлады, ня гледзячы на дзікі тэрор, падрыхтоўка да 1-га жніўня праходзіць вельмі інтэнсыўна.

Пралетарыят і працоўныя масы Польшчы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядучы актыўную барацьбу з фашысцкай дыктатурай, за палепшаньне дабрабыту, за работу і хлеб, вядучы актыўную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры за дыктатуру пралетарыяту, у дзень 1-га жніўня выступяць з лёзунгам—«Рукі прэч ад СССР», «Далоў імпэрыялістычную вайну», «Ператворым вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую».

І ня гледзячы на разгул тэрору, фашысцкаму ўраду ня ўдасца зламаць рэвалюцыйнай волі, баявой энэргіі працоўных мас Польшчы і прыгнечаных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Катастрафічная разруха прамысловасьці на Заходняй Беларусі

СПЫНЯЮЦЬ РАБОТУ ФАБРЫКІ, БАНКРУТУЮЦЬ ФІРМЫ, ЛІКВІДУЮЦЦА КРАМЫ.

ВІЛЬНЯ, 29. Катастрофа прамысловасьці і сельскай гаспадаркі на Заходняй Беларусі пашыраецца з нябачнай хуткасьцю. Штодня газэты паведамляюць аб масавых банкрутствах, аб закрыцьці фабрык і крам. З асаблівай сілай, з асаблівай вострасьцю катастрафічнае становішча выявілася ў дробнай саматужнай прамысловасьці. Дашчэнту зруйнаваны местачковыя і гарадзкія дробныя цясьлярныя, шавецкія і інш. майстэрні.

Так, «Дзеньнік Віленск» піша, што паводле няпоўных вестак, за апошні квартал на Віленскім ваяводзтве збанкрутавалі, зусім ліквідаваны наступныя прадпрыемствы: **«48 харчовых прадпрыемстваў, 98 спажывецкіх крам, 17 пякарняў, 11 млечарняй, 37 мясных крам, 8 заводаў вырабу ліманады, эльтэрскай і г. д., 2 цукерачныя фабрыкі, 7 хімічных прадпрыемстваў, 19 мэталёвых, 14 вырабу вопраткі, 14 гарбарняў, 2 папяровыя фабрыкі, 4 дрэва апрацоўчаныя заводы, 2 паліграфічных прадпрыемствы. Апроч таго, ліквідавана: 65 цясьлярскіх варштатаў, 44 сьлясарняў, 17 кузьняў, 78 шавецкіх майстэрняў, 29 кравецкіх майстэрняў і больш сотні іншых варштатаў розных галін прамысловасьці.**

Гэта далёка ня поўны пералік, пададзены «Дзеньнікам Віленскім». У большасьці эруйнаваныя і ліквідаваныя дробныя рамесьніцкія прадпрыемствы, якія зусім не рэгіструюцца. Дзясяткі тысяч сем'яў засталіся без кавалку хлеба. Беспрацоўе павялічваецца, а дапамога зусім зводзіцца да нуля.

Прычына масавага банкрутства, масавай ліквідацыі на Заходняй Беларусі дробных рамесьніцкіх прадпрыемстваў заключаецца ў тым, што надзвычайна зьбяднеў селянін-бядняк і серадняк, які зьяўляецца асноўным пакупнікам гэтых вырабаў. Сялянства непамерна вялікімі падаткамі, прымусовымі работамі на стратэгічна-ваенных дарогах даведзена да жабрацтва. Зразумела, што аб набыцьці вопраткі, або ботаў няма і гутаркі. Наадварот, паварот да лапцей, зварот да лучын, зварот да драўляных сох прыняў надзвычайна вялікія разьмеры ня толькі на Заходняй Беларусі і на Заходняй Украіне, але і ў карэннай Польшчы, захапіўшы частку самага багатага Пазнанскага ваяводзтва.

Фашысцкі ўрад, які шалёным тэмпамі рыхтуецца да ўзброенага нападу на СССР, высмоктвае апошнюю соку з працоўных мас, сьцягвае апошнюю кашулю за падаткі. Аб ніякай дапамозе, як зруйнаваным дробным рамесьнікам, так і даведзенаму да жабрацтва сялянству ня можа быць і гуткаркі. Пры дапамозе паліцэйскага бізуна, пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў—Астроўскага, Луцкевіча і інш., фашысцкі ўрад абдзірае працоўных Заходняй Беларусі.

Выхад з крызісу працоўныя масы Заходняй Беларусі ў цесным саюзе з працоўнымі ўсёй Польшчы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, зной дуць у рашучай барацьбе з фашысцкай дыктатурай, у нізрыцьці ўлады капіталістаў-памешчыкаў, у стварэньні сваёй дзяржавы—савецкай Польшчы.

Забастоўка францускіх тэкстыльшчыкаў сарвана рэфармісцкімі сацыял-здраднікамі

ПАРЫЖ, 28-VII. Як паведамляе «Юманітэ» на агульных сходах баступючых тэкстыльшчыкаў у Алюне, у Коліне і Вэрвіку прыняты, па прапанове франка-бэльгійскага стачачнага камітэту, рэзалюцыі аб аднаўленьні работы з 29 ліпеня.

У рэзалюцыях забастоўшчыкі кляймяць здрадніцтва рэфармісцкіх і каталіцкіх прафсаюзаў і заяўляюць ,што яны прыступяць да работы згрупаванымі масамі, аднак, ні 28-га як патрабуюць прадпрыемцы ,а 29-га, каб гэтым прадэманстраваць свой пратэст супроць здрадніцкай згоды. Забастоўшчыкі зазначаюць, што яны будуць працягваць пад кіраўніцтвам таго-ж цэнтральнага стачкому барацьбу на саміх прадпрыемствах за аднаўленьне заработку ў ранейшых разьмерах; гэта барацьба будзе весьціся з дапамогаю створаных на прадпрыемствах камітэтаў барацьбы і ўзмацненьня адзінства рабочага фронту. «Юманітэ» адзначае значнае зьмяншэньне ўплыву рэфармісцкіх правадыроў нават сярод рабочых, якія далучаюцца да рэфармісцкіх прафсаюзаў.

Арганізацыя сьвінафэрм пад пагрозай зрыву

Плян камплектаваньня сьвінафэрм выканан толькі на 19,1 проц.

Забясьпечыць арганізацыю сьвінафэрм у вызначаны тэрмін. Сьвінаводкалгасцэнтр, райкалгассаюзы, РВК, павярнецеся тварам да сьвінагадоўлі

Дабіцца выкананьня пляну сьвінагадоўлі

З усёй катэгарычнасьцю трэба адзначыць, што пляны арганізацыі сьвінагадоўчых фэрм знаходзяцца пад пагрозай зрыву. Замест вызначаных 1.300 фэрм, якія павінны быць арганізаваны і поўнасьцю ўкамплектаваны да 1-га жніўня г. г., на 20-га ліпеня арганізавана толькі 970 фэрм. У фэрмах пастаўлена 36.900 сьвінаматак, што складае 25,3 проц. заданьня.

У радзе раёнаў арганізацыя сьвінафэрмаў толькі пачынаецца, ці зусім не пачалася. У Лепельскім раёне не арганізавана ніводная сьвінафэрма; у Пралойскім раёне плян па арганізацыі сьвінафэрмаў выкананы на 11 проц., па ўкамплектаваньні сьвінаматкамі на 4,9 проц.; Камарынскім — арганізацыя сьвінафэрм — 12,5 проц., укамплектаваць не—8,5 проц.; Веткаўскім—арганізацыя сьвінафэрм—27,7 проц., камплектаваць не—6,7 проц .і г. д.

Недапушчальна марудна праходзіць здача сьвінагадоўчымі фэрмамі таварнай прадукцыі дзяржаве. Да гэтага часу фэрмы здалі 5.330 галоў (гадавое заданьне—180.000 галоў) ці 4,2 проц. заданьня. Бабруйскі раён выканаў плян па здачы таварнай прадукцыі на 3,2 пр. Брагінскі—1,4 проц. Клічаўскі 0,4 проц., Камарынскі—0,8, Веткаўскі—зусім нічога ня здаў, Гарадоцкі—16,2 проц.,

Прычыны такіх марудных тэмпаў арганізацыі і камплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм у пералічаных раёнах заключаюцца ў тым, што раённыя арганізацыі і сельсаветы апартуністычна недаацэнілі і не павярнуліся тварам да задач сьвінагадоўлі.

Трэба рашуча пакончыць з недаацэнкай арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмаў. Часу засталося вельмі мала. Калі ў бліжэйшыя дні ў гэтай справе ня будзе дасягнуты пералом, дык арганізацыя і камплектаваньне сьвінагадоўчых фэрм будзе сарвана.

Плян арганізацыі калгаснай сьвінагадоўлі можна і неабходна выканаць.

Пляны жывёлагадоўлі ў Клімаўшчыне пад пагрозай зрыву

Камплектаваньне сьвінафэрм выканана 16,5 проц., будаўніцтва матачнікаў—17,9 проц., пляны сіласаваньня за чэрвень —ліпень сарваны

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Рэйд брыгад газэты «Камуна» і РСІ правёў абсьледваньне Райза, Райкалгассаюзу, Райзапсаюзу і рад саўгасаў і калгасаў па пытаньні аб становішчы жывёлагадоўлі, арганізацыі сьвінагадоўчых і малочных фэрм і стварэньні кармовай базы. Абсьледваньне выявіла шмат прарываў на гэтым вучастку работы.

У большасьці сельсаветах і калгасах выкананьня пляну жывёлагадоўлі праходзіць самацёкам. Вакол гэтага пытаньня не мабілізавана грамадзкая думка. Па 10 сельсаветах (Галіцка-Міскім, Грэйвецкім, Хэтаўецкім, Кісялёва-Будзінскім і інш.) плян жывёлагадоўлі не распрацаваны.

З боку сельсавету і парт'ячэек адсут нічае кантроль за выкананьнем пляну жывёлагадоўлі.

Камплектаваньне сьвінамалочных фэрм праходзіць самацёкам

Да 1 студзеня 1932 г. у раёне павінна быць арганізавана 8 малочных таварных фэрм, у якіх павінна знаходзіцца 960 кароў і 48 бугаёў. На 1 ліпеня плян камплектаваньня выканан на 64 проц.

Дрэнна абстаіць справа са здачай малочнай прадукцыі. Плян здачы малочнай прадукцыі першага і другога кварталу поўнасьцю сарваны. Замест арганізаванай здачы малочных прадуктаў некаторыя калгасы прадаюць іх на прыватны рынак (калгас «Савецкая Беларусь»). Разбазарваюць малочныя прадукты таксама і ўнутры калгасаў (калгасы «Камунар Маслёўшчыны» і Зьвяза да Беларусі»).

Вельмі марудна таксама праходзіць арганізацыя сьвінагадоўчых фэрм. 28 калгасаў павінны спэцыялізавацца ў напрамку сьвінагадоўчым. На 1 ліпеня ў сьвінагадоўчых калгасах пастаўлена 764 сьвінаматкі, ці 16,5 проц. заданьня.

Камплектаваньне сьвінагадоўчых фэрм фактычна сарвана. Сьвінаматкі распалены па асобных калгасах. Райзапсаюз ня выканаў пляну па камплектаваньні малочных і сьвінагадоўчых фэрм за кошт жывёлазагатовак. На пляну трэба было перадаць малочным фэрмам 487 кароў, фактычна перадана 437 (89 проц.), цялят 1443—перадана толькі 188 (13 проц.), сьвіней 300—перадана толькі 160 (53 проц.).

Марудныя тэмпы будаўніцтва

Тэмпы будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў не забясьпечваюць своячасовага выкананьня пляну разьмяшчэньня камплектуемага статку. Малочных таварных фэрм, якія павінны быць гатовы да 1 студзеня 1932 г. пакуль што пабудавана толькі адна (калгас «Энэргія») і пачата будаўніцтва чатырох МТФ у калгасах: «Камунар Маслёўшчыны», «Іскра», «Чырвоны Маяк» і «Уперадзе». У 3-х калгасах зусім яшчэ не пачата будаўніцтва.

Сэзон паміж сканчэньнем сяўбы і пачаткам уборачнай кампаніі не скарыстаны для ўзмацненьня тэмпаў будаўніцтва. Райкалгассаюз зусім слаба кантралюе ход будаўніцтва. Няма практычнага кіраўніцтва, тэхнагляду, ня прымаюцца захады да арганізацыі будаўнічых брыгад.

Зрываецца таксама будаўніцтва сьвінарнікаў. Плянам прадугледжана сёлета пабудаваць: для паросных матак 28 сьвінарнікаў на 2625 галоў, для халастых матак 13 сьвінарнікаў на 1800 галоў і 13 адкормачных пунктаў на 3460 галоў, а разам 55 будынкаў на 7875 галоў. Фактычна пабудавана на 1 ліпеня г. г. пяць сьвінарнікаў для паросных матак, што складае 17,9 проц. пляну па будаўніцтву матачнікаў. Па зьвестках тэхніка Райкалгассаюзу, пачата будаўніцтва 20 сьвінарнікаў для паросных матак і 3 сьвінарнікі для халастых. Паданыя факты сьвядчаць аб тым, што плян будаўніцтва сьвінарнікаў фактычна сарваны.

Аб стварэньні кармовай базы не клапоцяцца

Для ўтрыманьня статку жывёлы і сьвіней патрэбна 124.334 тоны сакавітых і канцэнтраваных кармоў. Між тым усе кармовыя рэсурсы пасеву бульбы, кораньплодаў, вікі і інш. складаюць каля 103.00 тон, г. зн. што кармоў ня хопіць. У сувязі з гэтым сіласаваньне кармоў набывае выключнае значэньне. Плянам прадугледжана ў сёлетнім годзе пабудаваць 648 ям і 4 вежы і засіласаваць 17.455

Разгарнуць і ўзмацніць прамысловую каапэрацыю

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР пра прамысловую каапэрацыю

Посьпехі індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі выклікалі рост новых галін прамысловай каапэрацыі, якія маюць важнае значэньне для здаволеньня патрэб дзяржаўнай прамысловасьці і калектыўных гаспадарак, зьмяняюць характар існуючых промыслаў і павялічваюць значэньне прамысловай каапэрацыі ў народнай гаспадарцы.

За апошнія гады прамысловая каапэрацыя БССР дабілася наступных дасягненьняў: у 1929-30 г. г. прадукцыя павялічылася на 67 проц. у параўнаньні з 1928-29 г. г., адносная вага промыслаў, якія працуюць на мясцовай сыравіне, павялічылася з 37,4 проц. у 1928-29 г. да 40,4 проц. у 1929-30 г., на 1 чэрвеня 1931 г. уцягнута ў сыстэму ў вёсцы 13.750 беднякоў і сераднякоў у параўнаньні з 4.870 чал. на 1 кастрычніка 1929 г., у мястэчках за гэты самы час уцягнута 14.302 чал. у параўнаньні з 5.805 чал., доля прадукцыі, якая вырабляецца ў агульных майстэрнях, павялічылася да 95 проц. агульнай сумы прадукцыі сыстэмы, сацыяльны склад арцеляй у вынікуачысткі іх ад кулацкіх і нэпманскіх элемэнтаў палепшыўся.

Ня гледзячы на гэта, прамысловая каапэрацыя БССР не задавольвае ў патрэбных разьмерах узрастаючага попыту на яе прадукцыю, асабліва па промыслах, якія працуюць на мясцовай сыравіне (дрэваапрацоўка, лесахімія, будаўнічыя матарыялы, торф і г. д.). Кантрольныя лічбы за асобны квартал выкананы сыстэмаю толькі на 77 проц., прамфінплян за 6 мес. 1931 г. толькі на 35,9 гадовага пляну і на 86 проц. поўгадовага пляну, пры чым асабліва нездавальняюча выконваецца плян па найбольш ударных промыслах: (торф—55 прац. гадовага пляну, лесахімія—32,8 дрэваапрацоўка— 27,8 гаспадарцы краіны.

Недастатковае разгортваньне дзейнасьці прамысловай каапэрацыі тлумачыцца ўсё яшчэ слабаю актыўнасьцю самой сыстэмы, а таксама і недацэнкаю некаторымі цэнтральнымі і мясцовымі арганізацыямі значэньня прамысловай каапэрацыі ў народнай гспадарцы краіны.

Асноўнымі недахопамі ў працы прамыслова-каапэрацыйнай сыстэмы зьяўляецца: а) значнае паслабленьне ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы прынцыпаў гаспадарчага разрахунку, б) невыстарчальная работа па здабычы, па скарыстаньні ўтылю і адыходаў, па ўцягненьні сыравіны заказчыка, в) вельмі слабае тэхнічнае і вытворчае абслугоўваньне дзейнасьці арцеляй і капітальнага будаўніцтва сыстэмы, г) слабая работа па палепшаньні якасьці прадукцыі і па палепшаньні стандартаў, па зьніжэньні сабекошту і падвышэньні прадукцыйнасьці працы, недастатковае ўкараненьне ў арцелях прынцыпу зьдзельшчыны і недастатковае прыстасаваньне апошняй да задачы падняцьця якасьці прадукцыі, д) залішняя цэнтралізацыя, якая зьмяншае вытворчую ініцыятыву і самадзейнасьць каапэраваных мас, е) недастатковае яшчэ ўцягненьне ў сыстэму беднякоў і сераднякоў вёсак, асабліва калгасьнікаў, ж) слабае разгортваньне сацыялістычных мэтадаў, працы, асабліва ў мястэчковых і вясковых арцелях, з) слабая пастаноўка падліку выкананьня якасных паказальнікаў прамфінпляну і капітальнага будаўніцтва, е) засьмечанасьць клясаварожымі элемэнтамі некаторых арцеляў.

Раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы, а таксама іншыя раённыя і вясковыя арганізацыі (калгасы, спажывецкія таварыствы і інш.) недаўлічваюць ролі і значэньня прамысловай каапэрацыі ў народнай гаспадарцы. У некаторых мясцох пры правядзеньні калектывізацыі сельскай гаспадаркі былі ліквідаваны прамысловыя арцелі. Ня гледзячы на дырэктывы ўраду СССР і БССР, да апошняга часу некаторыя раённыя выканаўчыя камітэты забіралі ад прамысловай каапэрацыі асобныя прадпрыемствы.

У шмат мясцох члены арцеляў найбольш ударных промыслаў перакідваюцца на іншую працу. Ня гледзячы на востры недахоп тэхнічных кадраў у прамысловай каапэрацыі, ёсьць выпадкі зьняцьця з працы ў прамысловай каапэрацыі кваліфікаваных тэхнічных працаўнікоў.

Дзяржаўныя аб'яднаньні (Лесбел, Саюзскур і інш.) не зварочваюць патрэбнай увагі на забясьпечаньне прамысловай каапэрацыі сыравінаю паводле зацьверджаных урадам вытворчых плянаў сыстэмы.

Спажывецкая каапэрацыя ня цалкам забясьпечвае членаў арцеляў, нават ударных промыслаў, харчамі па ўстаноўленых для іх нормах.

Для разгортваньня і ўзмацненьня прамысловай каапэрацыі БССР і павялічэньня яе прадукцыі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Вытворчая праграма прамысловай каапэрацыі БССР на 1931 г.

1. Зацьвердзіць праграму прамысловай каапэрацыі БССР на 1931 г. па агуловай прадукцыі ў суме 171.300 тыс. руб. у продажных цэнах, у тым ліку будаўнічых матарыялаў на 7154,7 тыс. руб., торфу на 1590 тыс. руб., лесахімічнай прадукцыі на 12467,1 тыс. р., вырабаў дрэваапрацоўчых промыслаў на 27435,1 тыс. руб. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія і сельскія саветы рабіць усялякую дапамогу прамысловай каапэрацыі ў выкананьні яе вытворчых праграм і вызначыць практычныя мерапрыемствы для ўзмацненьня мясцовых органаў і арцеляй прамысловай каапэрацыі і далейшага павялічэньня выпуску ёю прадукцыі.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы раённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім і сельскім саветам дапамагаць прамысловай каапэрацыі ў забясьпечаньні рабочаю сілаю найбольш ударных промыслаў: торф, будаўнічыя матарыялы, лесахімія і дрэва апрацоўка.

Забараніць забіраць рабочую сілу з сыстэмы прамысловай каапэрацыі без папярэдняга ўзгадненьня з Белсампрамсаюзам.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Белкаапсаюзу забясьпечваць членаў арцеляў дрэваапрацоўчага, лесахімічнага і торфавага промыслу праз лясную і торфавую каапэрацыю.

Прапанаваць Белсампрамсаюзу разам з Белкаапсаюзам арганізаваць грамадзкае харчаваньне для членаў прамысловых арцеляў найбольш ударных промыслаў.

Прапанаваць НК Снабжэньня і Вел. Канторы «Саюзпрамкорму» забясьпечыць транспартныя арцелі і транспарт пры цагельных, лесахімічных і дрэваапрацоўчых промыслах фуражом на аднолькавых умовах з транспартам іншых каапэрацыйных арганізацый, а Народнаму Камісарыяту Земляробства і раённым выканаўчым камітэтам адвесьці для загатоўкі фуражу для транспарту прамысловай каапэрацыі лугавыя вучасткі.

4. Прапанаваць ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Снабжэньня забясьпечыць перадачу прамысловай каапэрацыі адыходаў і аддкідаў з фабрык і заводаў дзяржаўнай прамысловасьці. Прапанаваць Лесбелу поўнасьцю забясьпечыць прамысловую каапэрацыю драўнінаю, патрэбнаю для выкананьня яе вытворчых праграм на 1931 г., і неадкладна заключыць адпаведныя дагаворы з Белсампрамсаюзам.

5. Для поўнага забясьпечаньня вытворчай праграмы прамысловай каапэрацыі на 1932 г. прапанаваць Лесбелу разам з Белсампрамсаюзам на працягу месяца распрацаваць парадак снабжэньня прамысловай каапэрацыі драўнінай на 1932 г., а таксама ў гэты-ж тэрмін у тых мясцох, дзе Лесбел ня зможа поўнасьцю забясьпечыць вытворчую праграму прамысловай каапэрацыі гатовай драўнінаю, адвесьці Белсампрамсаюзу для самастойных лесараспрацовак дзялянкі ў бліжэйшых да прадпрыемстваў прамысловай каапэрацыі лясох.

6. Прапанаваць ВСНГ забясьпечыць больш поўнае скарыстаньне арцеляй прамысловай каапэрацыі для вырабу дэталяй і паўфабрыкатаў, патрэбных дзяржаўнай прамысловасьці, і для абслугоўваньня дзяржаўнай прамысловасьці рамонтам, забясьпечыўшы пры гэтым прамысловую каапэрацыю патрэбнаю сыравінаю і дапаможнымі матарыяламі. Прапанаваць ВСНГ, Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Дзяржпляну пры распрацоўцы кантрольных лічбаў на 1932 г. забясьпечыць максымальную увязку працы прамысловай каапэрацыі з адпаведнымі галінамі дзяржаўнай прамысловасьці.

7. Прапанаваць Белсампрамсаюзу разгарнуць і ўзмоцніць працу па зборы і апрацоўцы ўтылысыравіны і мэталялому. Дазволіць прамысловай каапэрацыі скарыстоўваць сабраную ёю ўтылысыравіну і мэталялом для сваіх патрэб.

8. Адзначаючы недастатковае разгортваньне справы рамонту абутку і адзеньня, прапанаваць:

а) Белсампрамсаюзу ўжыць усе захады да пашырэньня сеткі рамонтных майстэрняў і да разгортваньня вырабу падэшвенных сурагатаў;

б) гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць гэтыя майстэрні памяшканьнямі, устанавіўшы за карыстаньне імі мінімальныя тарыфы;

в) Беларускаму Аддзяленьню Усесаюзнага Скураб'яднаньня ў адпаведнасьці з праграмамі рамонту абутку сваячасова забясьпечваць прамысловую каапэрацыю адпаведнымі скуртаварамі.

9. Прапанаваць Белсампрамсаюзу пашырыць работу на сыравіне заказчыкаў, забясьпечыўшы патрэбныя мерапрыемствы для правільнага абслугоўваньня іх.

10. Прапанаваць Белсампрамсаюзу зьвярнуць большую ўвагу на арганізацыю пральняў, цырульняў, чайных, сталовак і іншых прадпрыемстваў для абслугоўваньня бытавых патрэб працоўнага насельніцтва.

II. Узаемаадносіны прамыслова-каапэрацыйнай сыстэмы з калгаснаю сыстэмаю.

11. Абавязаць Белсампрамсаюз сканцэнтраваць сваю дзейнасьць у калгасах, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі.

12. Абавязаць Белкалгасцэнтр і Белсампрамсаюз аднавіць прамысловыя арцелі ў калгасах і ўжыць патрэбныя захады да іх узмацненьня і далейшага разгортваньня.

13. Члены прамысловых арцеляй, якія уваходзяць у калгасы і маюць сельскую гаспадарку, апрамаджваюць паводле статуту калгасу сродкі сельскагаспадарчай вытворчасьці і плацяць уступны ўнос у разьмерах ад 5 да 25 рублёў у залежнасьці ад моцнасьці гаспадаркі. Члены прамысловых арцеляй, якія ўваходзяць у калгасы і ня маюць сродкаў сельскагаспадарчай вытворчасьці, плацяць уступны ўнос як рабочыя.

14. Умовы карыстаньня калгасамі і прамысловымі арцелямі рабочаю сілаю ў час найбольш напружанай працы ў сельскай гаспадарцы ці ў прамысле ўстанаўляюцца дагаворамі паміж кіраўніцтвам калгасу і кіраўніцтвам арцелі і прадугледжваюцца ў вытворчых плянах абедзьвюх арганізацый. Умовы аплаты за карыстаньне памяшканьнем, абсталяваньнем, інвэнтаром, фуражом, прадуктамі харчаваньня, а таксама ўмовы і разьмеры скарыстаньня прадукцыі і паслуг прамысловых арцеляй для патрэб калгасаў устанаўліваюцца адпаведнымі дагаворамі паміж калгасамі і прамысловымі арцелямі на падставе дырэктыў Белкалгасцэнтру і Белсампрамсаюзу.

15. Усе існуючыя прамысловыя арцелі астаюцца ў калгасах, як самастойныя арганізацыі, якія працуюць паводле свайго статуту і ўваходзяць у сыстэму прамысловай каапэрацыі. У выпадках аднячасовага ўдзелу адных і тых-жа сем'яў у прамысловых арцелях і калгасах, устанавіць, што першыя члены сем'і працуюць на промыслах пераважна перад работаю ў сельскай гаспадарцы.

16. Прапанаваць Белсампрамсаюзу і Белкалгасцэнтру ўжыць усе захады да арганізацыі ў калгасах новых прамысловых арцеляй, да максымальнага разгортваньня ў гэтых арцелях промыслаў на мясцовай сыравіне, а таксама да арганізацыі транспартных арцеляй.

17. У тых вёсках ці мястэчках, дзе саматужныя промыслы зьяўляюцца галоўным, а сельская гаспадарка дапаможным заняткам насельніцтва, могуць арганізоўвацца на дабравольных асновах мяшаныя прамыслова-сельскагаспадарчыя арцелі (прамкалгасы), якія ўваходзяць у сыстэму прамысловай каапэрацыі.

18. У галіне сельскагаспадарчай дзейнасьці на падставе свайго вытворчага пляну прамкалгас заключае з адпаведным калгасным аб'яднаньнем дагавор аб кантрактацыі, якім устанаўліваюцца абавязкі прамкалгасу па арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасьці і пляновай здачы ўсяе сельскагаспадарчай таварнай прадукцыі дзяржаве і каапэрацыі, а таксама абавязкі калгаснага аб'яднаньня і іншых устаноў дзяржаўных і каапэрацыйных органаў па зьбясьпечаньні прамкалгасаў сродкамі вытворчасьці і прадметамі спажываньня і па арганізацыі крэдытнай дапамогі і эгра-тэхнічнага абслугоўваньня прамкалгасу.

Прапанаваць Белсампрамсаюзу вылучыць частку сваіх фондаў для каапэраваньня і калектывізацыі беднаты на фінансаваньне капітальных укладаньняў у прамкалгасы.

19. Даручыць Белкалгасцэнтру і Белсампрамсаюзу на працягу месяца заключыць паводле гэтай пастановы і ў адпаведнасьці з пастановамі СНК СССР за 2 чэрвеня 1930 г. і 28 чэрвеня 1931 г. «Пра саматужную прамысловасьць і прамысловую каапэрацыю» (З. З. СССР 1930 г., № 30, арт. 338, 1931 г., № 41, арт. 284) генэральны дагавор аб працы прамысловай каапэрацыі ў калгасах і даць належныя інструкцыі мясцом.

20. Прапанаваць Белпрамсаюзу арганізаваць спэцыяльны сэктар па працы ў калгасах і па працы з прамкалгасамі.

III. Арганізацыйная структура прамысловай каапэрацыі.

21. Для палепшаньня кіраваньня сыстэмаю, яе вытворчага і тэхнічнага абслугоўваньня, сапраўднага ўкараненьня ў сыстэму гаспадарчага разрахунку, палепшаньня асартымэнту і якасьці прадукцыі, стварыць на падставе адзінства членства, капіталу і кіраваньня наступныя рэспубліканскія галінныя, гаспадарча-разрахунковыя (сындыкацкага тыпу) аб'яднаньні, якія кіруюцца Прэзыдыумам Беларускага Саюзу Прамысловай Каапэрацыі, па такіх вытворчасьцях:

1. Дрэваапрацоўцы і лесазагатоўках.
2. Лесахімічнай і хімічнай.
3. Будаўнічых матэрыялаў, кераміцы і вапнавым угнаеньні.
4. Торфавай прамысловасьці.
5. Мэталяапрацоўцы.
6. Тэкстыльна-швэйнай.
7. Скурабутковай.
8. Харчова-смакавай.
9. Абслугоўваючых прадпрыемстваў.

Аб'яднаньні маюць права юрыдычнай асобы і дзейнічаюць паводле статутаў, якія зацьвярджаюцца Прэзыдыумам Беларускага Саюзу Прамысловай Каапэрацыі.

Прапанаваць Белсампрамсаюзу на працягу дэкады распрацаваць праект рэарганізацыі другога зьвяна сыстэмы і падаць на зацьверджаньне Эканамічнага Савету.

22. Абавязаць Народны Камісарыят Працы і ВСНГ дапамагчы Белсампрамсаюзу ў справе ўкамплектаваньня апарату прамыслова-каапэрацыйнай сыстэмы спэцыялістамі, а ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Асьветы пры выпусках студэнтаў вышэйшых школ вылучаць для прамысловай каапэрацыі патрэбную колькасьць спэцыялістаў. Прапанаваць Белсампрамсаюзу разгарнуць працу па падрыхтоўцы патрэбных для сыстэмы кадраў і па вылучэньні з сыстэмы лепшых працаўнікоў на кіруючую работу.

23. З тае прычыны, што прынятыя прамысловаю каапэрацыяю прафтэхшколы ў некаторай частцы не прыстасаваны да патрэб сыстэмы, даручыць Белсампрамсаюзу правесьці адпаведную рэарганізацыю прафтэхшкол, узгадніўшы гэтае пытаньне з ВСНГ.

Прапанаваць ВСНГ, Народнаму Камісарыяту Асьветы і Народнаму Камісарыяту Працы аказаць прамысловай каапэрацыі дапамогу ў справе ўкамплектаваньня прафтэхшкол настаўнікамі і тэхнічнымі кадрамі і ўключыць сетку школ прамысловай каапэрацыі ў агульны плян забясьпечаньня кадрамі школ; Народнаму Камісарыяту Асьветы аказаць дапамогу ў камплектаваньні сэктару кадраў Белсампрамсаюзу, а ВСНГ аказаць дапамогу Белсампрамсаюзу ў забясьпечаньні прафтэхшкол патрэбнаю сыравінаю, матар'ялам і абсталяваньнем.

24. У сувязі з неабходнасьцю падняцьця тэхнічнай базы прамысловай каапэрацыі даручыць ВСНГ, народным камісарыятам, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам перадаць прамысловай каапэрацыі бязьдзейныя прадпрыемствы і нескарыстанае абсталяваньне дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці, саўгасаў і інш. і аказаць сыстэме патрэбную дапамогу ў атрыманьні абсталяваньня з цэнтру па заяўках прамысловай каапэрацыі на 1931 г.

Прапанаваць ВСНГ разам з Белсампрамсаюзам праз месяц падаць у Эканамічны Савет сьпіс прадпрыемстваў, якія перадаюцца прамысловай каапэрацыі.

25. Даручыць Белсампрамсаюзу ўжыць рашучыя захады да збору адлічэньняў у фонд доўгатэрміновага крэдытаваньня і забясьпечыць сваячасовае фінансаваньне капітальнага будаўніцтва, прымаючы жорсткія меры ўзьдзейнічаньня ў адносінах да тых арганізацый, якія нядбайна адносяцца да справы адлічэньняў у фонд доўгатэрміновага крэдытаваньня.

26. Абавязаць Белсампрамсаюз правесьці на працягу бліжэйшага месяца рашучыя мерапрыемствы для ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы і забясьпечаньня поўнага і сваячаснага падліку і справаздачнасьці ў сыстэме, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падлік выкананьня калькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну і капітальнага будаўніцтва. Вакол гэтых важнейшых задач разгарнуць у сыстэме праз масавую працу сацыялістычныя мэтады працы: сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

27. Прапанаваць Белсампрамсаюзу ўзмоцніць змаганьне з праніканьнем у органы прамысловай каапэрацыі клясава-чужых элемэнтаў.

28. Для паскарэньня звароту вырабаў прамысловай каапэрацыі, даручыць Белсампрамсаюзу адчыніць ня менш 20 раздробных магазынаў, узгадніўшы пункты з Народным Камісарыятам Снабжэньня.

Прапанаваць старшыням гарадзкіх саветаў даць для гэтай мэты ў распараджэньне прамысловай каапэрацыі адпаведныя памяшканьні.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.
30 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра арганізацыю супроць пажарнай аховы ў саўгасах і калгасах

Для арганізацыі і належнай пастаноўкі супроцьпажарнай аховы ў саўгасах і калгасах, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Галоўнаму Кіраўніцтву Камунальнай Гаспадаркі разам з НК Земляробства распрацаваць тыпавыя правілы пра пажарную аховы ў саўгасах і калгасах і ўстанавіць мінімальныя нормы забясьпечаньня іх пажарным інвэнтаром абсталяваньнем.

2. Абавязаць Саўгастрэсты і Белкалгасцэнтр даць паказаньні кіраўнікам саўгасаў і кіраўніцтвам калгасаў аб тым, каб яны прадугледзелі патрэбныя выдаткі на набыцьцё пажарнага інвэнтару і абсталяваньня, а таксама ўлічыць патрэбы аб'яднаных імі саўгасаў і калгасаў у пажарным інвэнтары, а Беларускае Аддзяленьне «ВЗОК» ужыць захады да задаволеньня заявак саўгастрэстаў і Белгасцэнтру на пажарны інвэнтар.

3. Для ўзьняцьця на належны ўзровень супроцьпажарнай аховы ў саўгасах і калгасах устанавіць варту для аховы ад пажараў і арганізаваць належнае ўтрыманьне пажарнага інвэнтару і абозу, скарыстоўваючы супроцьпажарныя сродкі толькі на беспасрэднае прызначэньне.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам на працягу аднае дэкады пераглядзець усе абавязковыя пастановы пра пажарную аховы ў саўгасах і калгасах з мэтаю ўзмацненьня рэпрэсіўных мер да асоб, якія парушаюць правіла супроцьпажарнае аховы і папярэджаньня пажараў.

5. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты разгарнуць працу па арганізацыі дабравольных пажарных дружын.

6. Для кіраваньня і сталага нагляду за становішчам пажарнай аховы ў саўгасах і калгасах і на тэрыторыі раёнаў увесьці ў штат раённых выканаўчых камітэтаў пасаду пажарнага інструктара па аднаму на кожны раён.

Прапанаваць Галоўнаму Кіраўніцтву Камунальнай Гаспадаркі арганізаваць пажарна-тэхнічныя курсы для падрыхтоўкі адпаведных кадраў, а Народнаму Камісарыяту Фінансаў прадугледзець выдачу патрэбных сродкаў на арганізацыю гэтых курсаў.

7. Прапанаваць Пракуратуры Рэспублікі справы аб пажарах у саўгасах і калгасах разглядаць без чаргі, узмоцніўшы рэпрэсіі ў адносінах да службовых асоб, вінаватых у невыкананьні правіл супроцьпажарнай аховы.

8. Прапанаваць дырэктарам саўгасаў і кіраўніцтвам калгасаў вылучыць асоб, пэрсанальна адказных за супроцьпажарную аховы ў саўгасах і калгасах.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.
23 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

У бой за торф

Жнівень—штурмовы месяц у барацьбе за торф

Пастанова прэзыдыуму і калегіі ЦКК-НКРСІ Бел.

па праверцы ходу выкананьня пастановы ЦК КП(б)Б і СНК Бел. ад 13—16-VII—31 г. па тарфяной прамысловасьці БССР

ад 27-VII—31 г.

Канстатаваць, што з боку раду арганізацый і асоб былі праяўлены недапушчальныя апартуністычныя і бюракратычныя адносіны па выкананьні дырэктыў ЦК і СНК Бел. ад 16-VII—1931 г. аб торфараспрацоўках.

У прыватнасьці лічыць устаноўленым:

1. Рашэньне ЦК і СНК аб мабілізацыі 25 рахункавых працаўнікоў для тарфяной прамысловасьці ня выканана, рад кіраўнікоў арганізацый, якія павінны былі накіраваць рахункавых працаўнікоў, праявілі бюракратычна-ведамственны ладыход. Так, канкрэтна: дасылка Аптэкакіраўніцтвам замест кваліфікаванага рахункавага працаўніка—архіваруса, пры наяўнасьці штату рахункавых працаўнікоў з 16 кваліфікаваных асоб; дасылка Бел. Аддз. Дзяржвыдавецтва РСФСР жворага—на спэцыяльнасьці таксатара і рахункаводзтва зусім ня ведаючага Міхалковіч; накіраваньне ў распараджэньне Белторфу Менрайпрамсаюзам рахункавода Блітштэйна, стаж якой не перавышае 3-х дзён, як толькі што скончыўшай курсы.

2. Зусім марудныя, з адступленьнем ад устаноўленых тэрмінаў, тэмпы выкананьня іншых пунктаў пастановы ЦК і СНК, ускладзеных на ВСНГ і Белторф. У прыватнасьці застаецца на цалкам выкананай пастанова ў частцы: накіраваньне рабочых ад прадпрыемстваў на торфазаводы, вярбоўкі рабсілы па лініі калгасаў і аддзелаў працы на мясцох; яшчэ няма пералому ў справе зьнішчэньня абязьлічкі на торфазводах і поўнага забясьпячэньня пераводу торфазводаў на кругласутачную працу.

Выходзячы з паказанага Прэзыдыум ЦКК і Калегія НК-РСІ Беларусі пастанаўляе:

а) За фармальна-бюракратычныя і зядбайныя адносіны да выкананьня пастановы ЦК і СНК, адзначаныя ў п. 1 данай пастановы, справу ў адносінах галоўбухаў Аптэкакіраўніцтва, Бел. Аддз. Дзяржвыдавецтва РСФСР і Менсампрамсаюзу (Шкоднікава, Марголіна, Позьняка) накіраваць у адпаведныя ЦП прафсаюзаў для арганізацыі на працягу 10 дзён грамадзкага суду.

Справу адносна кіраўнікоў памянёных устаноў т.т. Бурштэйна (Аптэкакіраўніцтва, Агеева (Бел. Аддз. Дзяржвыдавецтва РСФСР), Шварца (Менрайпрамсаюз) накіраваць для прыцягненьня да партадказнасьці Мен. Гар. КК КП(б)Б. Нам. заг. вуч. пляц. экан. сэктару Белторфу тав. Грынгаузу за нерэагаваньне на ненармальнасьці з боку вашэй пералічаных арганізацый і накіраваньне на торфазводы заведамна не адпавядаючых рахункаводных працаўнікоў, дасланых у распараджэньне Белторфу—абвясьціць суровую вымову.

За невыкананьне ў вызначаны тэрмін п. 14 пастановы ЦК і СНК аб накіраваньні на торфазводы рахункаводных працаўнікоў, што застаецца ня выкананым і дагэтуль (на 25-VII) т. Найніцкаму-заг. Мен. гар. аддз. працы абвясьціць вымову.

б) Паказаць пералічаным у пастанове ЦК і СНК асобам, на якіх ускладзена адказнасьць за сваячасовае правядзеньне ў жыцьцё памянёнай пастановы, на яўна марудныя і зусім недапушчальныя тэмпы, пры якіх працякае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК, папярэдзіўшы іх, што ўсялякія далейшыя тормазы і марудныя па поўным і канчатковым ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК і СНК пацягнуць за сабой самую суровую адказнасьць.

в) Прапанаваць Прэзыдыуму ВСНГ на працягу 3-х дзён праверыць выкананьне дырэктыў ЦК і СНК Бел. асобамі, на якіх ускладзена персанальная адказнасьць за выкананьне рашэньняў ЦК і СНК Бел. па лініі ВСНГ і Белторфу.

г) Пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня ЦК і Нарком РСІ БССР
Калнін.

Зводка выкананьня плянаў здабываньня торфу на торфазаводах БССР

за 26 ліпеня 1931 г.

Назва заводаў.	Проц. выкан.
1. „Чырвоны Тарфянік".	92.8
2. „Ленінскі Шлях"	95.
3. Асінторф	85.
4. Закрашынскі Мох	76.
5. Дзяльаўка.	72.
6 „Шлях Сацыялізму"	60,8
7. „Большавік."	58,4
8. Міханавічы	53,1
9. „Свабода"	48 1
10. Грэбянёва	39,8

Толькі 66,6 проц.

У Каралішчавічах (Менскі раён), рэалізацыя пазыкі сярод калгасніка сэктару дасягнула 5.760 руб., што складае 206 проц. заданьня. Сярод служачых і рабочых падпіска дасягнула 1.255 руб., што складае 98 проц. заданьня. Сярод сялян аднаасобнікаў аблігацый прадана на суму 1.015 руб., што складае 12,7 проц. Такім чынам, агульнае заданьне па сельсавеце выканана на 14-га ліпеня на 66,6 проц.

Алісіевіч І. А.

ПРАМКААПЭРАЦЫЯ БССР ДА IV ЗЬЕЗДУ

28 ліпеня г. г. адкрыўся IV-ы Усебеларускі зьезд працаўнікоў прамкаапэрацыі. Гэты зьезд зьяўляецца гістарычным, які павінен адзначыць далейшыя задачы прамкаапэрацыі і яе шляхі далейшага разьвіцьця.

Значэньне прамкаапэрацыі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва было адзначана з усёй яскравасьцю пастановаю XVI-га зьезду УсеКП(б), апошняй пастановай СНК СССР ад 28 чэрвеня 1931 г. і пастановай СНК БССР ад 25 ліпеня 1931 г., дзе было адзначана, што прамкаапэрацыя мае вялікае значэньне для ўсёй народнай гаспадаркі краіны. Прамкаапэрацыя павінна выпусьціць прадукцыі на 180 мільёнаў рублёў.

Прамкаапэрацыя БССР прышоўшы на свой IV-ы зьезд можа адзначыць, што яна пасьля адхіленьня былога апартуністычнага кіраўніцтва, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б пасьпяхова разьвівалася. Яна здолела за апошнія два гады заняць значнае месца ў сацыялістычным сэктары народнае гаспадаркі. У 1931 г. сыстэма прамкаапэрацыі працуе больш чым у 100 промыслох, дзе ахапляе каля 50.000 каапэраваных у арцельным сэктары замест 18.000 каапэраваных да III-га Усебеларускага зьезду прамкаапэрацыі, які адбыўся ў 1929 г. Характарна адзначыць, што 95 проц. з усяго ліку каапэраваных працуюць у агульных майстэрнях у той час, калі па ўсім Саюзе ССР занятых у агульных майстэрнях 60 проц., а іх прадукцыя складае 75 проц.

Вырабляемая прадукцыя прамкаапэрацыяй ідзе галоўным чынам на лініі вытворчасьці, садзейнічаючых разьвіцьцю прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Толькі за 1931 год прамкаапэрацыя БССР дае прадукцыі па будматар'ялах на 5 мільёнаў 299 тысяч, мэталёапрацоўчай—на 11 мільёнаў 255 тысяч рублёў, лесахэміі—частка якой ідзе на экспарт—на 15 мільёнаў 732 тысячы р., дрэваапрацоўчай на 27 мільёнаў 435 тысяч руб., па тэкстылю і апрацоўцы валакна—на 45 мільёнаў 283 тысячы р. і г. д. і г. д., а таксама дадае лёгкую індустрыю, выпушчае тавары шырокага спажываньня.

Трэба адзначыць рост прамкаапэрацыі ў мястэчку і ў вёсцы, давядзеньне ўдзельнай вагі каапэраваных у вёсцы да 31 проц. на 1 чэрвеня 1931 г. і мястэчках—да 34 проц. з аднячасовым павялічэньнем удзельнай вагі каапэраваных на мясцовай сыравіне з 37,4 проц. у 1928-29 г. г. да 40,4 проц. у 1929-30 г. г. і да 54,5 проц. на 1 ліпеня 1931 году.

Прамкаапэрацыя Беларусі мае некаторае дасягненьне, праўда, досыць ня значнае ў разгортваньні работы ў калгасах і арганізацыі прамкалгасаў; усяго арганізавана па БССР 34 прамкалгасы з 2071 гаспадаркамі.

Вялікую работу прарабіла прамкаапэрацыя ў справе рамонту абутку рабочым гораду, калгаснікам і іншым працоўным масам, асабліва ў больш буйных рабочых цэнтрах (Менск, Гомель, Віцебск і інш. раб. р-нах). За апошні час маюцца, як у рабочых цэнтрах, так і ў калгасах, пры дзяржпрадпрыемствах і калгасах закрытыя майстэрні для рамонту абутку, у якіх за 5 месяцаў адрамантавана рабочым калгаснікам і гарнізонам—902.507 пар абутку.

Мы маем вялікі зрух у справе рамонту сельска-гаспадарчых машын за час вясеньняй кампаніі: плугоў, барон, калёс, хамутоў выраблена каля 30 тысяч штук і каля 20.000 штук дробнага сельска-гаспадарчага інвэнтара. Штомесячна адпускалася 1000 тон коламазі, галоўным чынам для МТС, калгасаў і саўгасаў.

У мэтах стымуляваньня выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і разгортваньня ўдарніцтва і сацспаборніцтва ў большасьці райпрамсаюзаў праводзяцца ўдарніцкія і сацспаборніцкія месячнікі, якія вялі да ліквідацыі прагулаў, а ў шэрагу раёнаў (Ушачы, Ліпнішкі і інш.) і да ліквідацыі ўдарніцтва. Ня ў адным месяцы ўдарніцтва і сацспаборніцтва ў большасьці раёнаў (Ушачы, Ліпнішкі і інш.) ахапляе ўсе прадпрыемствы і ўсіх рабочых

Ніводнага кілё лёну не павінна застацца ... да новых перамог!

... савецкіх межаў!

Белкалгасцэнтр апартуністычна адносіцца да падрыхтоўкі ўборкі лёну

Правільна арганізаваць працу ў калгасах, знайвышэйшай вытворчасьцю скарыстаць уборачныя машыны, дабіцца поўнага і ў тэрмін збору ...

Proletarjusze wszystkich krajów, łączce się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

У бой за суцэльна-пісьменную БССР

за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэвалюцыі

„Выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове разгортваньня шырокай падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году і вядзеньне гэтай работы, як баявой палітычнай кампаніі“
(з пастановы ЦК КП(б)Б)

На дырэктывы ЦК КП(б)Б адкажам мабілізацыяй працоўных мас на высоўваньне сустрэчных культплянаў, на іх датэрміновае выкананьне

Гарады і раёны, змагайцеся за атрыманьне ганаровага сьцягу ЦК КП(б)Б

Пастанова ЦК КП(б)Б па дакладу НКА а падрыхтоўцы да новага навучальнага году

ЦК КП(б)Б адзначае, што ў выніку рашучага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі і посьпехаў сапбудаўніцтва за мінулы навучальны год маецца значнае прасоўваньне ўперад на рашаючых вучастках культурнага будаўніцтва. Пасьпяхова праведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, выкананы ў асноўным плян ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, выкананы плян падрыхтоўкі кадраў для культфронту, значна пашыраны масавы рух рабочых і працоўных мас за культуру, тэхніку і новыя сацыялістычныя формы працы, зроблены некаторыя крокі да ўвязкі культурнага будаўніцтва з задачамі гаспадарчага і сацыялістычнага будаўніцтва.

Ня гледзячы на гэта, тэмпы культурнага будаўніцтва ўсё яшчэ адстаюць ад хуткіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і культурных запатрабаваньняў шырачэзных працоўных мас. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і адзначаныя вышэй дасягненьні ў галіне культбудаўніцтва ствараюць базу для новага культурнага ўздыму БССР і значнага паскарэньня тэмпаў культурнага будаўніцтва.

ЦК лічыць, што асноўнымі задачамі культбудаўніцтва ў 1931—32 годзе зьяўляюцца:

а) ПЕРАТВАРЭНЬНЕ БССР ДА 1-га МАЯ 1932 г. У КРАІНУ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ, ліквідаваўшы рэшткі няпісьменнасьці сярод рабочых і прызыўнікоў да 1-га кастрычніка 1931 г.;

б) поўнае выкананьне пляну абавязковага навучаньня і ахоп школай усіх дзяцей ад 8 да 11 год; школамі-курсамі ўсіх няпісьменных і малапісьменных падлеткаў 12-15 год; увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе сямігодкі для ўсіх дзяцей у гарадох, прамысловых цэнтрах, фабрычна-заводзкіх паселках і прымежных раёнах;

в) пасіленьне тэмпаў разгортваньня сеткі ШКМ і ФЗС у адпаведнасьці з сеткай тэхнікумаў і ФЗВ па ўсіх галінах народнай гаспадаркі; разгортваньне сыстэмы курсаў, рабфакаў, заочнага навучаньня з тым, каб забясьпечыць прыём у ФЗВ, тэхнікумы і ВНУ па ўсіх галінах народнае гаспадаркі і культуры;

г) БАРАЦЬБА ЗА ПАВЫШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ ўсёй работы масавых школ і ў прыватнасьці перабудова яе на падставах палітэхнізацыі з прыстасаваньнем да эканамічнага профілю кожнага раёну; разгортваньне дашкольных устаноў з разьлікам ахопу імі ўсіх дзяцей работніц і калгасьніц;

д) далейшы рашучы паварот усёй культасьветнай работы да выкананьня прамфінпляну і сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г. да барацьбы за генэральную лінію партыі супроць правага і «левага» апартунізму, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, нацыянал-дэмакратызму, за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі;

е) першачарговае абслугоўваньне культработай прамысловасьці (асабліва новых будоўляў) і ў прыватнасьці арганізацыя мэтадычнага кіраўніцтва ўсімі формамі работы па аўладаньні тэхнікай.

Выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове разгортваньня шырокай падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году і вядзеньня гэтай работы, як баявой палітычнай кампаніі.

Мім тым мясцовыя, партыйныя, савецкія, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі недаацанілі значэньня гэтай работы. Падрыхтоўка да новага навучальнага году праходзіць яўна нездавальняючымі тэмпамі. Органы нарасьветы яшчэ не ператварыліся ў сапраўдныя штабы культурнай рэвалюцыі, тэмпы работы па арганізацыі культпаходу нездавальняючыя, адсутнічае адзіны плян культурнага будаўніцтва, рад устаноў у прыватнасьці Белкаапсаюз, Белдзяржснаб, Белкалгасцэнтр ня выканалі дырэктыў партыі і ўраду па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году (у прыватнасьці па забясьпечаньні вопраткай, абуткам і г. д.). У асабліва нездавальняючым становішчы знаходзіцца школьнае будаўніцтва, вакол якога не мабілізаваны сродкі і сілы і ўвага грамадзкасьці.

Выходзячы з гэтага, ЦК пастанаўляе:

1. Прафсаюзным арганізацыям, партыйным і камсамольскім арганізацыям і органам НКА узмацніць работу па правядзеньні культпаходу, асноўнай мэтай якога паставіць мабілізацыю шырокіх мас працоўных для падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

2. РК КП(б)Б неадкладна рэалізаваць пастанову ЦК аб арганізацыі саветаў культурнага будаўніцтва пры РВК і сельсаветах, паставіўшы перад імі ў якасьці асноўнай задачы стварэньне і правядзеньне ў жыцьцё адзінага пляну культурнага будаўніцтва ўсіх грамадзкіх арганізацый і дзяржаўных устаноў, якія вядуць культработу. Ажывіць работу камітэту ўсенабучу пры СНК БССР.

3. Разгарнуць паміж гарадамі і раёнамі сацыялістычнае спаборніцтва па культурным будаўніцтве. Вызначыць у якасьці прызу для гораду, ці раёну, які першы дасягне ўсеагульнай пісьменнасьці і лепшых паказьнікаў па культурным будаўніцтве ганаровы сьцяг ЦК КП(б)Б.

4. РК КП(б)Б і НКА мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, а таксама ўвагу і сродкі грамадзкасьці вакол школьнага будаўніцтва. Прыраўнаць школьнае будаўніцтва да першачарговага.

Даручыць СНК прыняць тэрміновыя меры для забясьпечаньня новага набору інтэрнатамі, праз паскораньне будаўніцтва агульных памяшканьняў барачнага тыпу.

5. Прапанаваць БДВ, Цэнтрвыдату і Белкаапсаюзу забясьпечыць выпуск падручнікаў і праграм і давесьці іх у школы да 1-га верасьня 1931 г. Камітэту па справах друку і паліграфаб'яднаньню забясьпечыць бесьперабойнае снабжэньне выдавецтва неабходнай паперай для выданьня падручнікаў.

6. Скончыць да 1-га кастрычніка прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і МТС арганізаваць шырокую грамадзкую праверку ўжо заключаных дагавораў. Рэарганізаваць рад ФЗС і ШКМ у дасьледчыя школы па пытаньнях палітэхнізацыі. ЦСПСБ разам з НКА правесьці ў прамысловых цэнтрах шырокія рабочыя канфэрэнцыі па палітэхнізму.

7. Даручыць НКА, разам з ЦП саюзу працасьветы на працягу 1931-32г. ахапіць усіх настаўнікаў, якія ня маюць вышэйшай асьветы, вячэрнім і заочным навучаньнем. Для кіраўніцтва гэтай работай і падвышэньня кваліфікацыі кадраў нарасьветы з пачатку 1932 г. адкрыць дзяржаўны інстытут. Адкрыць у кожным раёне апорную школу, ператварыўшы яе ў цэнтр мэтадычнай дапамогі настаўніцтву.

8. РК КП(б)Б забясьпечыць неабходную колькасьць і якасьць набору ў пэдагагічныя навучальныя установы, ЦК ЛКСМБ мабілізаваць у пэд. ВНУ і пэдтэхнікумы ня менш 1.000 асоб.

9. Даручыць камісіі выкананьня неадкладна праверыць выкананьне гаспадарчымі арганізацыямі дырэктыў партыі і ўраду ад падрыхтоўцы да навучальнага году (забясьпечаньне абуткам, вопраткай, палітэхнічнымі прыладам, сьнеданьнем і г. д.). У прыватнасьці зьвярнуць увагу на выкананьне дырэктыў аб палепшаньні матэрыяльна-прававога становішча настаўніцтва.

10. СНК прадугледзець у народнагаспадарчым пляне на 1932 г. павялічэньне кантынгенту культасьветных устаноў і грашовых асыгнаваньняў, якія будуць забясьпечваць выкананьне пастаўленых задач у культурным будаўніцтве.

11. Адзначаючы слабае асьвятленьне ў друку работы па культурным будаўніцтве і ў прыватнасьці падрыхтоўкі да новага навучальнага году, прапанаваць цэнтральным і мясцовым газэтам больш шырока і паглыблена асьвятляць культбудаўніцтва ў БССР.

ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што выкананьне задач культурнага будаўніцтва зьяўляецца абавязковай умовай агульнага наступленьня сацыялізму і завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, што выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове пастаноўкі іх як баявых палітычных задач пры актыўным удзеле ўсяе КП (б)Б, камсамольскіх арганізацый, усіх асьветнікаў і шырачэзнай пралетарскай грамадзкасьці.

Падрыхтавацца да ўраджаю і апрацоўкі лёну

23 ліпеня 1931 году адбылося паседжаньне Савету Народных Камісараў. На паседжаньні былі заслуханы даклады цэнтральных і нізавых арганізацый аб ходзе падрыхтоўкі да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель.

Паседжаньне СНК адзначала, што вакол пытаньняў уборкі і апрацоўкі лёну і канапель не мабілізаваны шырокія масы рабочых МТС, саўгасаў, калгасаў, бядняцка-серадняцкага сялянства і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Цэнтральны, раёны і нізавы друк таксама не аддае належнай ўвагі пытаньням уборкі і апрацоўкі лёну і канапель.

Белкалгасцэнтрам нават яшчэ ня спушчана ў раёны прыкладная рабочая праграма па ўборцы і апрацоўцы лёну і канапель.

Будаўніцтва льноканопляводных заводаў знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. На 10 ліпеня 1931 г. будаўніцтва льнозаводаў, пры забясьпячэньні рабочай сілай, пры здавальняючым забясьпячэньні дэфіцытнымі будматар'яламі, як-то: цьвікі 22,2 проц., вапна 57,0 проц., жалеза 22,5 проц., выканана на 22 проц. Зусім не пачата будаўніцтва Магілёўскага, Бабруйскага і Пухавіцкага заводаў.

Няправільнае разьмеркаваньне дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў паміж будаўніцтвам заводаў бяз уліку чарговасьці будаўніцтва, так заводы першай чаргі забясьпечаны: цэглай на 45 пр., другой чаргі—на 60 проц., трэцяй чаргі—на 62 проц., цэмэнтам першай чаргі на 67 проц., другой—на 70 проц., трэцяй на 76 проц. і чацьвертай—на 98 проц., цьвікамі першай чаргі на 24 проц., другой—на 23 проц., трэцяй—на 30 проц., жалезам першай чаргі на 14 проц., другой на 30 проц., трэцяй на 23 проц. чацьвёртай—на 20 проц.

Дырэктывы саюзнага ўраду і партыі аб будаўніцтве льнозаводаў у лёнаводных раёнах у першую чаргу ў пунктах МТС, парушаны.

Праўленьне Белльноканоплеводбуду не забясьпечыла дастатковага апэрацыйнага кіраўніцтва будаўніцтвам, а паасобныя РВК да гэтага часу не аддаюць належнай ўвагі гэтаму будаўніцтву і не аказваюць рэальнай дапамогі.

Тэмпы завозу машын для ўборкі і апрацоўкі лёну і канапель і іх прасоўваньне да калгасаў і саўгасаў не забясьпечваюць поўнага выкананьня пляну завозу да пачатку ўборкі.

Белсампрамсаюз не арганізаваў вырабу льномалатарняў «Эдзі», чым паставіў пад пагрозу зрыву сваячасовае забясьпячэньне льноводных саўгасаў і калгасаў машынамі па абмалоце лёну.

Белкалгасцэнтр, Белльноканоплеводсаюз і РВК не забясьпечылі арганізацыі і кіраўніцтва справай вучоты наяўных сьцелішч і вадаёмаў для мочкі лёну і канапель і падрыхтоўкі новых мачыльных ям, а таксама ня прынялі захадаў да сваячасовай арганізацыі і абсталяваньня пунктаў па першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель і на мясцох гэтыя работы амаль не распачаты.

Падрыхтоўка кадраў для льноўборачнай кампаніі не разгорнута.

Выходзячы з усяго гэтага Савет Народных Камісараў прапануе:

Белкалгасцэнтру, Саўгастрэсту і РВК забясьпечыць уборку лёну і канапель у вызначаныя НК Земляроблства тэрміны:

З мэтай рацыянальнага скарыстаньня рабочай сілы ў саўгасах і калгасах для ўборкі і апрацоўкі лёну і канапель, прапанаваць Белкалгасцэнтру, у залежнасьці ад напрамку сельскай гаспадаркі раёну, распрацаваць календарны плян уборачнай кампаніі з тым, каб забясьпечыць уборку і апрацоўку лёну у максымальна кароткія тэрміны.

Белкалгасцэнтру і Белканапляводсаюзу забясьпечыць сваячасовую арганізацыю пунктаў па першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель і мачыльных ям для забясьпячэньня апрацоўкі ўраджаю 1931 г.

Белкалгасцэнтр і Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру павінны не пазьней 10 жніўня г. г. закончыць падрыхтоўку неабходных кадраў для ўборкі і апрацоўкі лёну і канапель.

Старшыні Пухавіцкага, Магілёўскага і Бабруйскага РВК, у выпадку незабясьпячэньня з боку РВК у адпаведнасьці з пастановай СНК за 13-III (прат. № 2 п. 11) пабудоры льнозаводаў у гэтых раёнах, будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Нам. дырэктара Белдзяржснаба т. Дабравольскі на працягу дэкады павінен выканаць пастановы СНК і Камісіі выкананьня аб забясьпячэньні будаўніцтва льнозаводаў дэфіцытнымі будаўнічымі матар'ялам.

Белльнопенькатрэст, павінен дабіцца, перад Галоўленкомам перадачы Белльнопенькатрэсту Лёзьнянскага і Дрысенскага заводаў.

НК Земляроблства павінен пераглядзець сьпіс льноапрацоўчых заводаў з мэтай максымальнага скарыстаньня тэмпаў будаўніцтва заводаў 1-ай чаргі і паскораньня пабудовы заводаў у найбольш важных льноводных раёнах у якіх арганізаваны МТС.

Трактарацэнтру неабходна пераключыць работу трактараў на асваеньне новых зямель (разворка сухадолаў і раскарчоўка), забясьпечыўшы падняцьце новых плошчаў пад пасеў лёну і канапель у 1932 г. у колькасьці ня менш 150 тыс. га.

Белкалгасцэнтр, упаўнаважаны Льноканоплеводтрэсту і РВК у калгасах і саўгасах усю работу па ўборцы і апрацоўцы лёну і канапель, павінны ў найхутчэйшы тэрмін перавесьці на зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку, укараняючы сацыялістычныя мэтады працы, адзначаючы прыклады ўзорнай работы прэміраваньнем лепшых ударнікаў і ўвязваючы ўсе мерапрыемствы па льноўборачнай кампаніі з далейшым уцягваньнем бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

НК Земляроблству і НК Асьветы неабходна забясьпечыць льноўборачную і апрацоўчую кампанію культурным абслугоўваньнем, бібліятэкамі, кіно.

27-VII—31 г.
г. Менск

Падрыхтоўку да ўборкі лёну на ударныя тэмпы

Белкалгасцэнтр і Белільнасаюз апартуністычна недаацанілі ўборку лёну

Сёлета ў БССР трэба ўбраць звыш 242 тыс. га лёну, ці на 55,5 проц., больш чым у мінулым годзе. Лён, як працаёмістая культура, асабліва ў час уборкі і апрацоўкі яго, вымагае вялікай напружанасьці сіл, чоткай і сваячасовай арганізацыі працы.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя акалічнасьці ў галіне падрыхтоўкі і ўборкі лёну як у цэнтры, так і на мясцох амаль нічога ня зроблена. Ня больш як праз дэкаду пачнецца ўборка лёну, але ні Белкалгасцэнтр, ні Белільнатрасты. Калі зараз ня будуць ужыты рашучыя захады для выяўленьня сьце лішчаў, натуральных і штучных вадаёмаў,—ёсьць небясьпека, што да пачатку зімы ў многіх мясцох лён застанецца неапрацаваным.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца справа выпуску машын для ачосваньня галовак. Да 15 жніўня майстэрні Белсампрамсаюзу і іншых арганізацый павінны пабудаваць 800 машын сыстэмы «Эдзі». Ня гледзячы на тое, што да вызначанага тэрміну засталі-

Тав. ЗІНГМАН (Магілёўская прамкаапарцель «Вытворца»). Дэлегат IV Усебеларускага зьезду прамкаапэрацыі. Рацыяналізаваў льномалацілку, што дае шмат эканоміі.

На здымку: тав. Зінгман і рацыяналізаваная ім малацілка.

саюз належна не прапрацавалі пляну ўборкі ўраджаю, ніводная з гэтых арганізацый нічога ня ведае што робіцца на мясцох і ці робіцца што наогул у справе падрыхтоўкі да ўборкі. Варта адзначыць так: факт вялікай бязтурботнасьці цэнтральных устаноў, калі ў час гарачай падрыхтоўкі да ўборкі і ў Белкалгасцэнтры, і ў Белільнасаюзе спэцыялісты-ільнаводы атрымалі водпуск, з гэтае прычыны спынілася ўся работа па падрыхтоўцы да ўборкі.

Найбольш слабым месцам у ланцугу ўборкі і першапачатковай апрацоўкі лёну зьяўляецца расьсьціл і мочка яго. Неабходна так арганізаваць справу, каб з гэтай работай справіцца да пачатку зімы. Але на мясцох нічога ня зроблена, каб выявіць наліччa сьцелішчаў і мачыльных ям, што ставіць пад пагрозу сваячасовую падрыхтоўку і ся лічаныя дні, выпушчаныя машыны налічваюцца адзінкамі. Калі ў далейшым ня будзе дасягнуты пералом, калі майстэрні будуць працаваць ранейшымі тэмпамі,—плян выпуску машын для ачосваньня галовак будзе сарваны, а разам з гэтым і плян апрацоўкі лёну.

Падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю лёну трэба паставіць на ўдарныя тэмпы. Час ня церпіць. Неабходна на хаду выправіць дапушчаныя памылкі Белкалгасцэнтр, Белільнасаюз і раённыя партыйныя і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі павінны па баявому ўзяцца за падрыхтоўку да ўборкі першапачатковую апрацоўку лёну.

Мы павінны дабіцца ня толькі поўнай і сваячасовай ўборкі лёну але сваячасовай апрацоўкі яго.

К. І.

Будаўніцтва лёназаводаў зрываецца

Церахаўка. 29-VII (БелТА). Павсюдле пляну, пабудова лёназаводу павінна быць скончана да 15 жніўня з такім разьлікам, каб да 1 кастрычніка завод быў абсталяваны і пушчаны ў ход.

На сёньня будынак зроблены на 20-25 проц., кантора—на 60-65 проц., а да пабудовы шахі яшчэ толькі думаюць прыступіць.

Рабочай сілай будаўніцтва не забясьпечана; замест патрэбных 42 рабочых на сёньня працуюць толькі 12. Лесаматэрыял на жубатуры атрыманы поўнасьцю, але неадпавядаючага асартымэнту. Цэглы патрэбна 50 тысяч, а загатоўлена 26 тысяч.

Аб абсталяваньні завода ні кіраўнік будаўніцтва, ні дзесятнік нічога ня ведаюць.

Гомельская кантора, якая кіруе будаўніцтвам, ніякай тэхнічнай дапамогі не дае. Загадчык будаўніцтва і дзесятнік нават ня ведаюць ці правільна яны будуюць.

Спажывецкая каапэрацыя ніколькі не зацікаўлена ў будаўніцтве, харчаваньне не наладжана, а ў выніку ўзрастае недахват рабочай сілы.

Белкалгасцэнтр да ўборкі лёну не падрыхтаваўся

Уборка лёну набліжаецца, але Калгасцэнтр як сьлед да яе не падрыхтаваўся.

Лёнамяльныя пункты яшчэ толькі цяпер пачынаюць арганізоўвацца. Пляном прадугледжана арганізаваць у кожным раёне лёнамяльны пункт; паводле-ж маючыхся вестак, у раёнах арганізавана толькі 11 такіх пунктаў.

Падрыхтоўка кадраў для апрацоўкі лёну праводзіць чарапашымі тэмпамі. Міжраённыя курсы лёнамяльшчыкаў у большасьці раёнаў яшчэ не арганізаваны.

Дрэнна праходзіць падрыхтоўка мачыльных ям і сушыльных пунктаў. і

Прэміявальныя фонды маюцца... толькі на паперы. Нецярпімым зьяўляецца тое, што нарады для атрыманьня прэміявальных прамтавараў дадзены, але Белдзяржснаб гэтых нарадаў ня выконвае і абмяжоўваецца толькі тым, што абяцае.

Такое становішча з падрыхтоўкай да ўборкі і апрацоўкі лёну можа прывесьці да зрыву лёназагатовак.

Ня лепш абстаіць справа і з прапалкай лёну. Тэрмін прапалачнай кампаніі даўно ўжо скончан. Па калгасах-жа БССР на 10-VII—31 г. плошча лёну, паводле вестак Белкалгасцэнтру праполата толькі на 33 проц. Сталы вучот аб праполцы лёну адсутнічае.

Усяго на калгасах БССР засеяна лёну 108.539 га, што складае 125 проц. плянавага заданьня. Такая плошча лёну патрабуе максімуму ўвагі і кіраўніцтва Белкагсцэнтру. Адна, мы гэтага ня бачым.

Літаратура па вырашчваньні і апрацоўцы лёну зараз толькі рассылаецца па раёнах. Фонды для прэміяваньня лепшых ударнікаў прапалачнай ня створаны.

Такія адносіны Калгасцэнтру да гаспадарча-палітычнай кампаніі нецярпімы.

Белкалгасцэнтру патрэбна зараз-жа, на хаду праверыць падрыхтаванасьць да ўборкі лёну.

Брыгада «Савецкая Беларусь»
Я. Чарняўскі. Пучынскі.

Будаўніцтва лёназаводу стаіць на кропцы замярзаньня

Лепель. 29—VII. (БелТА). Ураджай лёну па ўсім раёне добры. На тысячах га скончана праполка. Адстае з праполкай лёну калгас «Чырвонаармеец».

Падрыхтоўка да ўборкі лёну разгорнута, але тэмпы яе не гарантуюць посьпеху. Спынена будаўніцтва лёнапрацоўчага пункту. У Каменскім сельсавеце, лёназавод ня будуецца больш ужо, як м-ц, а трэба будзе апрацаваць тысячы тон лёну.

Раўняцца па камуне „Авангард“

Камуна «Авангард», Мазырскага раёну, пасьпяхова справіўшыся з уборкай сена, адразу прыступіла да ўборкі збожжа. У часе работы на полі паміж брыгадамі камунараў было шырока разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Гэтыя бальшавіцкія тэмпы работы і моцная працоўная дысцыпліна забясьпечылі камуне вялікія посьпехі на фронце ўборачнай. На 20-га ліпеня камуна цалкам скончыла ўборку азімых і некаторых тэхнічных культур. Да 25-га ліпеня ўбралі ўвесь лён і частку канапель (плоскані). Апроч гэтага за час уборачнай кампаніі камунары некалькі разоў арганізоўвалі «вaскрэсьнікі» па лесазагатоўках. Зараз усе камунары з трактарам і снапавязалкай выйшлі на дапамогу на ўборку ўраджаю падшэфнаму калгасу «Чырвоная Зорка».

Брыг. «С. Б.»: Сяргейчык, Гундараў.

Ліквідаваць прарывы ў падрыхтоўцы да збожжазагатовак

Пастанова бюро скаргаў ЦКК НК-РСІ па праверцы гатоўнасьці складаў да прыёму новага ўраджаю

Праверка гатоўнасьці да прыёму збожжа новага ўраджаю выявіла, што амаль ніводная ўстанова складаў да прыёму новага ўраджаю не падрыхтавала. Толькі самая праверка рабочай брыгады прымусіла асобных работнікаў Саюзхлеба, НКСнабу і іншых загатоўчых арганізацый задумацца аб складах.

Праверка выявіла, што шмат устаноў нават і ня ведаюць, каму будуць належаць склады ў час загатовак (Саюзхлеб, Белкаапсаюз і інш. установы), яны спрачаюцца паміж сабою за склады.

Падобныя адносіны стварылі такое становішча, што склады ў большасьці не раманталіся і не ачышчаліся ад сьмецьця і бруду. Наогул патрэбная падрыхтоўка складаў да гэтага часу адсутнічала амаль што ва ўсіх установах.

Што да раёнаў, дык там аб неаходнасьці падрыхтоўкі складаў ма' быць і ня ведаюць, бо нават зьвестак аб ходзе падрыхтоўкі складаў няма.

Выходзячы з гэтага бюро скаргаў пастанаўляе:

1. Прапанаваць Саюзхлебу, БКС і інш. загатоўчым арганізацыям тэрміново праверыць усе склады, якія маюцца для прыёму новага ўраджаю. Усе склады павінны быць у двухдэкадны тэрмін адрамантаваны, ачышчаны ад сьмецьця і падрыхтаваны для прыёму новага ўраджаю.

2. Усім кіраўніком устаноў па загатоўках ураджаю (БКС, Хлебсаюз і інш.) устанавіць адзіны плян загатовак і мець дагаворанасьць на склады паміж сабою для выкананьня пастаўленых задач у загатоўчай кампаніі.

Адначасова забясьпечыць загатоўкі спэцыялістамі і рабсілай і сваячасовай расстаноўкай іх па загатоўчых пунктах.

3. Прапанаваць Саюзхлебу, БКС і інш. установам, зьвязаным з загатоўкамі новага ўраджаю, забясьпечыць загатоўкі новага ўраджаю тарай.

Прапанаваць апошнім праверыць ход падрыхтоўкі раённых арганізацый да прыёму новага ўраджаю, а таксама забясьпячэньне складамі і рабсілай.

4. Прапанаваць Саюзтрансу мэханізаваць транспарт і прыстасаваць апошні да хуткага абслугоўваньня прыёму новага ўраджаю.

5. Адміністрацыі Менскай станцыі МБВ чыгункі падрыхтавацца да хуткай падачы вагонаў для перавозкі новага ўраджаю, а таксама нагрузкі і разгрузкі, забясьпечыць неабходнай колькасьцю шчытоў і г. д.

6. Пастанову абвясьціць у друку і праз дэкадны тэрмін праверыць яе выкананьне.

Нам. Заг. Бюро Скаргаў ЦКК НК РСІ Матусэвіч.

Аб'ява

Паведамляецца, што ў гор. Менску з 15 жніўня пачынае працаваць выязная партройка ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцый па рашэньні ЦКК КП(б)Б.

Парадак разгляду апэляцый наступны:

15-VIII будуць разглядацца апэляцыі т. т.

1) Котаў М.М.—Журавіцкі раён, 2) Трычэнка Я. Р.—Каралінскі раён, 3) Чушчыц А. Л.—Калінкавіцкі раён, 4) Небажэнка Е. А.—Ворша, 5) Карпаў У. С.—Борквавічы, 6) Цярэшка М. М.—Церахаўскі р., 7) Аўруцін Я. М.—Віцебск, 8) Баркоўскі—Мазырскі раён, 9) Лабаноўскі Я. С.—Халопеніцкі раён, 10) Шавро Т. А.—Лепельскі 11) Фралоў В. У.—Ворша, 12) Ермашогін Я. І.—Ворша, 13) Муц І. І.—Жыткавіцкі р., 14) Сухадольскі П. Я.—Чырвонапольскі р., 15) Сідараў П. Ф.-Койданаўскі р., 16) Захараў К. Е.—Віцебск. 17) Пчалкоў В. Ф.—Дрэтунь, 18) Маслоўская П. Ф.—Нова-Барысаў, 19) Маркін В. С.—Бабруйск, 20) Вікторэнка—Чаўсы, 21) Раслаўцаў Л.—Гомель, 22) Дземчанка І. Г.—Полацак, 23) Савіткоў А. В.—Расоны, 24) Скавырка А. І.—Полацак, 25) Круглікаў В. Ф.—Полацкі р., 26) Кушняроў І. А.—Крупскі р., 27) Базылёнак Я. М.-Віцебск, 28) Шакун—Слуцкі раён, 29) Эльянаў С. С.—Менск, 30 Брушко С. Т.—Менск, 31) Каханоўская С. Л.—Менск, 32) Бэрнацкі Я. С.—Менск, 33) Жытнікаў А. К.—Менск, 34) Левін С. А.—Менск, 35) Шыманскі М. П.—Менск, 36) Кантаровіч—Менск, 37) Варашылаў А. Р.—Менск, 38) Левін Б. Н.—Менск, 39) Чарняўскі М. Р.—Гомель, 40) Несьцяронак А. К.—Полацак, 41) Красноў П. М.—Віцебск.

На 16-VIII—31 г.

1) Пятрушка І. К. Бабруйск, 2) Лірнаў Н. А. Гарадокскі р., 3) Грыбоўскі П. Х. Рагачоў, 4) Хлоткоў П. В. Полацкі р., 5) Куляш Р. Х. Уваравіцкі р., 6) Бірыла С. Ф. Пухавіцкі р., 7) Галоўкін А. А. Бабруйск, 8) Юрэвіч В. Я. Плешчаніцкі р., 9) Юроўскі Л. М. Бабруйскі р., 10) Караткевіч П. К. Быхаў, 11) Матальтін В. М. Крычаўскі р., 12) Фішэр Н. Б. Бярэзіно, 13) Пятрусевіч Э. С. Плешчаніцы, 14) Волгіна М. І. Ветрынскі р., 15) Фралоў М. М. Жыткавічы, 16) Сігер С. В. Віцебск, 17) Мемеўскі Е. А. Жлобін, 18) Сакольчык А. Ф. Полацак, 19) Сіманаў П. А. Магілёў, 20) Кончыц В. Е. Чаўсы, 21) Сенкевіч П. Я. Лепельскі р., 22) Фарбман Я. С. Віцебск, 23) Бабіцкі А. М. Мазыр, 24) Балабуткін Л. Л. Сіроцінскі р., 25) Юшпрайх Г. І. Нова-Беліца, 26) Селіберaў С. Ц. Заслаўскі р., 27) Бутна-Шляхта Лёзьнянскі р., 28) Глушцёў А. П., 29) Воўк О. Ц. Менск, 30) Хітрово Г. Н. Менск, 31) Шляшынскі Л. І. Менск, 32) Слушко І. В. Менск, 33) Ольман А. Нараўлянскі р., 34) Бяляеў П. Ч. Чачэвіцкі р., 35) Карначоў Менск, 36) Кузнец Менск, 37) Герасімаў М. М. Гомель, 38) Добыш П. С. Бягомльскі р., 39) Катковіч В. Ф. Капыльскі р., 40) Сосін І. Д. Менск.

Паседжаньне ПТ ЦКК УсеКП(б) будзе адбывацца ў памяшканьні ЦКК КП(б)Б (г. Менск, Савецкая 55).

Просьба да апэлюючых зьявіцца без спазьненьня.

Праезд за свой асабісты кошт.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б Рыскін.

Апартуністы зрываюць падпіску ў вёсцы

Старшыня Талачынскага райпрафсавету Руды і сакратар местачковага савету Лушчынскі перашкаджаюць брыгадзе НКФ праводзіць работу па пазыцы

Сельсаветы Сіроцінскага раёну: Вобельскі, Клетчанскі, Баранкаўскі, Высьвейскі, Мішнаўскі не праводзяць ніякай работы па распаўсюджваньні пазыкі. Да адказнасьці вінаватых у зрыве фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва!

Толькі зараз успомнілі...

Сіроціна. (Наш кар.). Да 20 ліпеня становішча з рэалізацыяй пазыкі ў Сіроцінскім раёне было пагражаючае.

Зараз РК і РВК ва ўсе сельсаветы вылучаны брыгады па правядзеньні дэкадніка рэалізацыі пазыкі ў вёсцы, брыгады таксама вылучаны і ад сельсаветаў. У выніку разгорнутай работы маецца некаторы зрух па сельсаветах. Напрыклад, Амбросаўскі сельсавет выканаў заданьне на 95 проц., Заронаўскі—на 80 проц. Але большасьць сельсаветаў былога Вульскага раёну, зараз прымацаваных да Сіроцінскага, вельмі адстаюць: Вобельскі, Клетчанскі, Баранкаўскі, Высьвейскі, Мішнаўскі, дзе на 20ліпеня ня было рэалізавана ніводнай аблігацыі. Да апошняга часу заданьне ня было даведзена да калгасаў. Зараз у гэтых сельсаветах разгортваецца растлумачальная работа.

На 25 ліпеня агульнае заданьне па ўсім Сіроцінскім раёне выканана толькі на 45 проц., (адсутнічаюць зьвесткі з 2-х сельсаветаў). Буксірная брыгада з Віцебску яшчэ ня прыбыла, яе прыбыцьця чакаюць гэтымі днямі.

Патрэбна мабілізаваць усе сілы на выкананьне заданьня і на ахоп усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў пазыкай.

Н. Дварсон.

Брыгада НКФ сыгналізуе

Руды і Лушчынскі перашкаджаюць рэалізацыі пазыкі

Становішча з рэалізацыяй пазыкі па Талачынскім раёне на 27 ліпеня характарызуецца наступным: у першых 13 сельсаветах ад Коханаўскага і Круглянскага раёнаў у Талачынскі раён, на сёньняшні дзень ніякай работы па рэалізацыі пазыкі не праведзена. Гэтыя сельсаветы нават ня маюць кантрольнай лічбы. Намі арганізаваны брыгады з студэнтаў, якія тут знаходзяцца ў адпачынку, таксама і прафарганізацый, якія разьехаліся па гэтым сельсавеце. Гэтыя таварышы намі праінструктаваны і атрымалі на рукі аблігацыі.

Фонд прэміраваньня ў гэтым раёне зусім не папулярызаваны, нават кіруючыя арганізацыі, як банк і райфа ня ведалі, што пры ашчаджасе маецца фонд для прэміраваньня лепшых камсодаў і г.д. па рэалізацыі пазыкі. Талачынскі раён мае усе даныя, (як калектывізаваны на 57 проц.), каб рэалізацыю пазыкі скончыць на працягу ўдарнай дэкады, але апартуністычныя адносіны з боку райпрафсавету—тав. Рудога і сакратара местачковага савету тав. Лушчынскага, якія ня цікавяцца гэтай справай і нават перашкаджаюць мерапрыемствам, якія праводзіла брыгада па рэалізацыі пазыкі,—гэту справу зрываюць.

Пасьля доўгіх упорстваў з боку тав. Лушчынскага і нежаданьня дапамагчы брыгадзе ў стварэньні брыгад для пасылкі на вёску, дамовіліся і намеркавалі сьпіс у колькасьці 12 асоб студэнтаў, якія знаходзяцца ў мястэчку. Тав. Лушчынскі абяцаў брыгадзе гэтых людзей накіраваць для інструктажу. Гэта ўсё былі толькі словы, ён аб гэтым нават і ня думаў.

Райпрафсавет лічыць, што дапамагчы ў справе рэалізацыі пазыкі—гэта не яго справа. Пытаньне аб скліканьні нарады было пагоджана з райпрафсаветам, прадстаўнік якога не зьявіўся і сарваў нараду, дзякуючы чаму выезд на вёску быў на дзень пазьней. Такія тэмпы ў працы нашых прафарганізацый ставяць пад пагрозу выкананьне фінпляну раёну.

Выкананьне кантрольнай лічбы па Талачыне складае 70

Разгарнуць і ўм

кадраў для кадраў

Посьпехі індустрыялізацыі краіны і ці
цыялістычнага перабудаваньня сель-
жай гаспадаркі выклікалі рост партыйных
галін прамысловай каапэрацыі БССР аб
ноўць важнае значэньне Дз. Унівэрсытэту
ня патрэб дзяржавы яго згодна гэтых па
калектыўных базу па падрыхтоўцы навуко
характар дасьледчых кадраў па фізыка-
матэматычных хэмічных і біялёгічных
спэцыяльнасьцях для навукова-
дасьледчых установаў і навукова-пэда-
гагічных кадраў для ВНУ і ВТНУ—
зьяўляюцца надзвычайна важнымі гі-
старычнымі рашэньнямі, якія яскрава
вызначаюць надалей ролю і значэньне
БДУ ў практычнай працы па ўсім
фронце нашага сацыялістычнага бу-
даўніцтва і культурнай рэвалюцыі.

Згодна пастановы СНК БССР ад
7 ліпеня 1931 г. Бел. Дз. Унівэрсытэт
складаецца ў сучасны момант з 4-х
факультэтаў: фізыка - матэматычнага,
біялёгічнага з аддз. батанікі і зааліёгіі, хэмічнага з глебазнаўчым аддзяленьнем, геаграфічнага.

БДУ павінен будзе надалей рыхтаваць высокакваліфікаваныя пэдагагічныя кадры па прыродазнаўчых і фізыка-матэматычных навуках для тэхнікумаў усіх відаў, рабфакаў і школ ФЗВ.

Лепшая частка па сваім сацыяльным становішчы і выяўленых здольнасьцях са скончыўшых вышэйпералічаныя факультэты рэарганізаванага БДУ і з ранейшага выпуску яго па фізыка-матэматычных, хэмічных і прыродных дысцыплінах, а таксама са скончыўшых іншыя ВНУ і ВТНУ па гэтых спэцыяльнасьцях будуць прымацца ў БДУ для падрыхтоўкі з іх праз 1½—2 гады навукова-дасьледчых працаўнікоў малодшага складу (асыстэнтаў, групаводаў, лябарантаў для ВНУ, ВТНУ, навукова-дасьледчых інстытутаў, лябораторый, станцый.

Гэтага тыпу навуковыя працаўнікі вельмі патрэбны зараз і, трэба сказаць, у значнай колькасьці, як для ВНУ, і ВТНУ БССР, так і навукова-дасьледчых установаў. Справа ў тым, што ў БССР з 1 жніўня 1931 г. будзе існаваць 25 толькі адных ВНУ і ВТНУ.

Нашы ВНУ і ВТНУ перайшлі ў сваёй працы на актыўныя мэтады выкладаньня. Гэта значыць, што высокакваліфікаваныя навуковыя працаўнікі—прафэсура і дацэнты пры колькасьці студэнтаў у групе ад 15 да 28 чал. павінны пераважна, і галоўным чынам, выкарыстоўваць для ўступных і заключных каафэрэнцый і лекцый.

Разам з тым, сац. будаўніцтва вымагае вялікай колькасьці навуковых працаўнікоў тыпу асыстэнтаў, групаводаў і лябарантаў для сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. **Навука і тэхніка павінны найхутчэй цалкам і поўнасьцю стаць на службу пралетарыяту, на службу сацыялістычнаму будаўніцтву.** Асабліва вялізарнае значэньне ў сацыялістычным будаўніцтве маюць хэмія, фізіка і прыродазнаўчыя навукі.

Зусім відавочна, што ня толькі ў бліжэйшыя гады, але нават ужо зараз нашы рэканструяваныя і пабудаваныя новыя гіганты фабрыкі, заводы, электрастанцыі, саўгасы, навукова-дасьледчыя інстытуты і станцыі, а таксама навучальныя ўстановы значна павялічаць колькасьць неабходных для іх нармальнай працы спэцыяльных навуковых лябораторый і габінэтаў. Такія фабрыкі, як Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Добрушская папяровая фабрыка, запалкавыя фабрыкі, Гомсельмаш, тэкстыльная прамысловасьць, скураная і харчавая прамысловасьць павінны мець на самой вытворчасьці добра абсталяваныя навукова-дасьледчыя лябараторыі заводскага тыпу для штодзённага сыстэматычнага навуковага ўплыву на палепшаньне якасьці прадукцыі.

Хэмічныя лябараторыі, заатэхнічныя, біялёгічныя і інш. павінны існаваць у кожным буйным саўгасе і калгасе, на камбінатах па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў і г. д. Асабліва вялікае значэньне павінны адыгрываць навукова-дасьледчыя лябараторыі і мэтэаралёгічныя станцыі для пасьпяховага сацыялістычнага вядзеньня сельскай гаспадаркі ў саўгасах, якія ўтвараюцца на мілёраваных тарфяных масывах БССР, на якіх густой сеткай расьцідваюцца магутныя спэцыялізаваныя фабрыкі тэхнічных і збожжавых культур і жывёлагадоўлі.

Адным словам усе віды сацыялістычнай прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і рост пралетарскай культуры для свайго пасьпяховага разьвіцьця настойліва патрабуюць безадкладнага навуковага абслугоўваньня высокакваліфікаванымі навуковымі кадрамі.

Лябараторыі нашых ВНУ, навукова-дасьледчых інстытутаў і дасьледчых станцый абслугоўваюцца зараз у пэўнай сваёй частцы выпадковымі і недастаткова падрыхтаванымі навуковымі працаўнікамі. Пры чым нават і такіх малакваліфікаваных навуковых працаўнікоў адшукаць для працы вельмі цяжка, бо навуковых працаўнікоў у БССР амаль ніхто не падрыхтоўвае ў такой колькасьці, каб задаволіць у асноўным нашы запатрабаваньні.

Трэцяй найважнейшай і адказнейшай задачай, пастаўленай перад БДУ зьяўляецца падрыхтоўка са скончыўшых хэмічны, біялёгічны, геаграфічны і фізматэматычны факультэты (шляхам 3-х гадовай асьпірантуры) высокакваліфікаваных навукова-пэдагагічных кадраў (дацэнты) для ВНУ і ВТНУ.

БДУ з наступнага акадэмічнага году (з восені 1931), рэканструяваўшыся ў адпаведнасьці з гэтай новай для яго мэтавай установкай, на новаму пачне сваю працу. БДУ, бязумоўна, мае ўсе даныя і ўсе магчымасьці для пасьпяховага вырашэньня пастаўленых перад ім партыяй і ўрадам новых задач на сучасным этапе нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Унівэрсытэт мае зараз вельмі спрыяючыя ўмовы для шырскага разгортваньня ў ім навукова-дасьледчай працы па падрыхтоўцы кадраў для кадраў. Новыя унівэрсытэцкія будынкі, лябараторыі, габінэты зьяўляюцца адными з лепшых на свайму навейшаму навуковаму абсталяваньню і свайму багацьцю ня толькі ў БССР, але і ў СССР.

З 1 жніўня гэтага году з БДУ згодна рашэньняў партыі і ўраду выдзяляюцца ў самастойныя ВНУ частка былога Пэдфаку, Наргас і Саўбуд. З былога факультэту Народнай Гаспадаркі (Наргас) утвараюцца 3 самастойныя інстытуты: 1) плянава-эканамічны інстытут, 2) фінансавы інстытут і 3) каапэрацыйны інстытут. Плянава-Эканамічны інстытут падпарадкаван будзе Дзяржпляну. Фінансавы Інстытут—Наркамфіну. Каапэрацыйны Іастытут—Белкаапсаюзу.

Факультэт Савецкага Будаўніцтва і Права (Саўбуд) выдзяляецца з БДУ ў самастойны інстытут Савецкага Будаўніцтва і Права. Ён падпарадкован будзе Аргадзделу ЦВК БССР.

З існаваўшых у БДУ гуманітарных аддзяленьняў Пэдфаку ўтвараюцца 2 самастойныя інстытуты: 1) Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут і 2) Палітасьветны Інстытут. Абодвы гэтыя інстытуты будуць зьяўляцца самастойнымі інстытутамі і будуць падпарадкаваны НКА. Вышэйшы Пэдінстытут застаецца ў Менску, а Палітасьветны Інстытут пераводзіцца ў Магілёў. Кожны з выдзеленых з БДУ інстытутаў будзе складацца з адпаведных факультэтаў і аддзяленьняў.

Уся рэарганізацыя БДУ павінна быць скончана да 1 жніўня 1931 г. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б рэарганізаваны БДУ узмоцніць яшчэ больш сваю працу. Ён павінен значна павялічыць тэмпы ў выкананьні пастаўленых перад ім новых задач Навуковых працаўнікі, асьпірантура і пралетарокае студэнцтва БДУ, уключыўшыся ўсёй сваёй масай у рэарганізацыю, у яскравае ўяўленьне сабе новых мэтавых установак унівэрсытэту, апрацаваўшы дасканала новыя навучальныя пляны і праграмы,—з яшчэ большым энтузіязмам возьмуцца, карыстаючыся ў сваёй штодзённай працы мэтадамі сацпаборніцтва і ўдарніцтва, за аўладаньне навукай, марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй, за арганічную шчыльную ўвязку навучальнай і навукова-дасьледчай працы з сацыялістычным будаўніцтвам.

Рэктар БДУ Я. Каранеўскі.

Усе на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны

Да ўсіх працоўных БССР

1-га жніўня рабочыя і працоўныя ўсяго сьвету выйдуць пад чырвонымі сьцягамі Камуністычнага Інтэрнацыяналу дэманстраваць супроць вайны, супроць крывавай бойні, супроць нападу на СССР. Яшчэ ніколі капіталістычны сьвет ня перажываў такі эканамічны крызіс, як зараз. Зачыняюцца фабрыкі і заводы, банкратуюць банкі, дзесяткі мільёнаў працоўных выкінуты на галодную сьмерць. Многа дзесяткаў мільёнаў старых і дзяцей, дарослых мужчын і жанчын асуджаны на голад і холад.

Капіталісты і абшарнікі ўсяго сьвету разам з соцыял. і нацыянал-фашыстамі хочуць выйсьці з гэтага крызіса шляхам яшчэ большага нажыму на рабочую клясу, шляхам яшчэ большай эксплёатацыі працоўных, шляхам нападу на бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету на СССР.

«Кожны раз, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія зварочвае свае вочы ў бок СССР, каб вырашыць тую ці іншую супярэчнасьць капіталізма, альбо ўсе супярэчнасьці разам узятыя за кошт СССР—краіны саветаў—сацыял. рэвалюцыі, рэвалюцыянізуючага адным сваім існаваньнем рабочую клясу і калёніі». (Сталін).

Толькі ў СССР няма ні адзінага беспрацоўнага, з кожным днём расьце і мацнее наша соцыялістычная гаспадарка. Мы з посьпехам завяршаем пабудову фундаманту сацэканомікі ў 3-ці рашаючым годзе пяцігодкі. Пяцігодка выконваецца ў 4 гады, а па некаторых вучастках прамысловасьці—ў тры і нават два з паловай гады. З кожным годам усе больш паляпшаецца добрабыт рабочых і працоўных мас. Больш паловы сялянскіх гаспадарак уступіла на шлях сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Правільная палітыка партыі забясьпечыла рашучы і канчатковы паварот серадняцкіх мас да соцыялізму. Магутны калгасны рух ахапіў мільёны сялянскіх гаспадарак, ствараючы новыя суадносіны клясавых сіл у краіне, ператвараючы серадняка, які ўступае ў калгас, у апору савецкай улады, ствараючы ўмовы для замены кулацкай вытворчасьці збожжа-вытворчасьцю саўгасаў і калгасаў. Ліквідуецца на аснове суцельнай калектывізацыі кулацтва як кляса.

З краіны, якая ў мінулым зьяўляла ся турмой народаў, СССР стала свабодным Саюзам свабодных сацыялістычных Рэспублік.

БССР—з краіны прыгнечанай царызмам, эканамічна адсталай, цемнай, напісьменнай —становіцца краінай сацыяльнай пісьменнасьці з дзесяткамі вышэйшых навучальных устаноў, сотнямі і тысячамі школ на роднай мове. Сотні тысяч экзэмпляраў газэт дзесяткі тысяч рабселькораў. Дзесяткі, сотні фабрык і заводаў, дзесяткі і МТС амаль палова сялянскіх гаспадарак аб'яднаных у калектыўныя гаспадаркі.

Вось вынікі разьвіцьця Савецкай Беларусі ў саюзе з усімі працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу.

Жорсткі эканамічны крызіс у капіталістычных краінах, буйны рост сацыялістычнага будаўніцтва СССР бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету — ўздымае на барацьбу мільёны працоўных капіталістычных краін і калёній. Працоўныя Нямеччыны, Польшчы, Англіі, Гішпаніі, Амэрыкі, Францыі Індыі і Кітаю — ня гледзячы на шалёны тэрор з кожным днём усё энэргічней змагаюцца з сваімі прыгнетацелямі, будуюць барыкады, мільёны працоўных Кітаю змагаюцца за сваю Савецкую ўладу.

Шляхам тэрору, забойстваў, карных экспэдыцый, капіталісты і прыгнетацелі ўсяго сьвету хочуць задушыць пады маючыяся на барацьбу працоўных. Сотні тысяч лепшых барацьбітаў запаўняюць турмы капіталістычных краін.

Чым больш расьце крызіс у капіталістычных краінах, чым больш расьце рэвалюцыйны ўздым працоўных усяго сьвету, тым больш расьце тэрор супроць працоўных, **тым больш набліжаецца небясьпека вайны,** ў першую чаргу напад на СССР.

Працэсы прампартыі, меншавікоў, лі хаманкавае ўзброеньне капіталістычных краін, пабудова стратэгічных чыгунак і шосавых дарог, рост вайсковых заводаў, высяленьне з прымежных месц Заходняй Беларусі рэвалюцыйных рабочых і сялян—паказваюць, што яшчэ ніколі ня была так блізка вайсковая небясьпека, як зараз.

Канфэрэнцыя прадстаўнікоў буйнейшых капіталістычных краін у Лёндане, каб «ратаваць» капіталістычную Нямеччыну перад пагрозай пралетарскай рэвалюцыі—згаварылася знайсьці выхад за кошт СССР.

Капіталісты, абшарнікі хочуць пагнаць мільёны працоўных ваяваць супроць сваіх братоў, супроць Савецкага Саюзу.

Ва ўсёй гэтай агіднай працы самым першым данаможнікам капіталістаў і абшарнікаў зьяўляюцца сацыял-фашысты і сацыял-інтэрвэнты. Аб гэтым гаварыў адбыўшыйся працэс меншавікоў, аб гэтым гаворыць штодзённая праца меншавікоў усяго сьвету. Яны, прыкрываючыся сваімі пацыфістскімі фразамі, хочуць накіраваць брата супроць брата і ў першую чаргу супроць Савецкага Саюзу, але-ж працоўныя ўсяго сьвету добра памятаюць сусьветную бойню, на якой былі забіты 10.000.000 чал., пакалечана 19.000.000 чал., засталіся мільёны ўдоў і сірот.

Рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне ўсяго сьвету выйдуць на вуліцу ў дзень 1-га жніўня ня гледзячы на тое, што супроць іх мабілізуецца паліцыя, войска і сацыял-фашысцкія банды.

Яны будуць дэманстраваць іх гатоўнасьць да барацьбы супроць вайны, супроць голаду, супроць тэрору ў абарону Савецкага Саюзу.

Таварышы рабочыя, работніцы, калгасьнікі, калгасьніцы і працоўныя!—Мы павінны заўсёды памятаць аб надыходзячай ваеннай небясьпецы, якая нам пагражае ў зрыве сацыялістычнага будаўніцтва. Мы павінны ўсімі сіламі рыхтавацца да абароны.

Палітыка Савецкае ўлады—гэта палітыка міру. Мы ня хочам вайны, але мы павінны быць гатовы заўжды да абароны. Мы будзем узмацняць абарону Савецкай краіны шляхам ажыўленьня і разгортваньня работы Асоавіяхіму, шляхам сталай дапамогі ў абароназдольнасьці Чырвонай арміі. Будзем узмацняць абарону бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну, поўнасьцю рэалізуем пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі», па баявому правядзем уборачную, нарыхтоўчую кампанію і асеньнюю сяўбу, памятаючы, што СССР зьяўляецца «ударнай брыгадай міжнароднага пралетарыяту».

Ні на хвіліну не забудзем аб нашых братох, якія змагаюцца за вызваленьне рабочае клясы, якія дзесяткамі тысяч пакутуюць на выспах і катаржных турмах у краінах капіталу. Ні на хвіліну не забудзем пакінуты без дапамогі жонак і дзяцей палітзьняволеных, якія таксама пакутуюць і галадуюць. Мы будзем узмацняць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас. Мы будзем узмацняць шчыльней рады МОПР'у.

Змагаючыся з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі ленінскай партыі, цясней згуртуем нашы рады для сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, з посьпехам выканаем народна-гаспадарчы плян 3-га рашаючага году пяцігодкі. Будзем яшчэ з большай энэргіяй разгортваць калектывізацыю сельскае гаспадаркі і на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуем кулацтва, як клясу.

Працоўная моладзь! Пад сьцягам ка муністычнае партыі напружвай свае сілы для сацыялістычнага будаўніцтва. Будзь гатоў да абароны СССР.

Дамо Чырвонай арміі стойкае клясава-вытрыманае, фізічна-здароваe папаўненьне.

Працоўныя жанчыны! Толькі дыктатура пралетарыяту дае поўнае разьвольваньне жанчыны. Арганізуйцеся для барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва. Пратэстуйце супроць крывавых плянаў капіталізму, супроць новых імпэрыялістычных войн. Узмацняйце абароназдольнасьць СССР.

Шчыльней рады вакол Ленінскай Камуністычнай Партыі.

З посьпехам перавыканаем народна-гаспадарчы плян 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Усе на абарону СССР, усе ў рады Асоавіяхіму.

Узмацнім дапамогу палітзьняволеных і іх сем'ям. Шчыльней згуртуем рады МОПР'у.

Няхай жыве СССР—сацыялістычная бацькаўшчына працоўных і прыгнечаных усяго сьвету.

Далоў імпэрыялістычныя войны.

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя.

Няхай жыве Камінтэрн—штаб сусьветнай рэвалюцыі.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі.
Цэнтральны Камітэт МОПР'У БССР.
Цэнтральны Савет Асоавіяхіма.

Поўнасьцю вывезьці загатоўлены лес

У Дрыбінскім раёне лесазагатоўкі праходзяць на хвалях самацёку. У Рэчыцы засыхае 28.000 куб. мэтр. драўніны. Да адказнасьці зрываючых лесазагатавіцельную кампанію

ЗВОДКА

аб ходзе дровалесазагатовак па Лесбелу на 21-VII 31 г.

	Выкананьне пляну па лесаматар'ялу		Процантнае выкан. па дровах	
	У проц. да заданьня			
	Гадавое	Квартальнае	Гадавое	Квартальнае
Бешанковіцкі	120,5	256,0	38,3	44,5
Віцебскі	120,9	124,2	71,4	28,2
Гарадоцкі	98,4	138,0	42,3	45,2
Ельскі	91,7	124,1	31,3	13,6
Слуцкі	78,1	154,1	60,4	13,8
Бабруйскі	69,4	140,8		
Гомельскі	127,3	48,6	55,2	19,4
Друцкі	75,9	21,7	24,9	26,9
Клімавіцкі	90,7	35,3	45,3	22,3
Менскі	88,0	51,2		
П. трыкаўскі	92,9	40,6	36,7	20,4
С уцкі	78,1	154,1	60,4	13,8
Хойніцкі	86,6	—		

ЗВОДКА

аб ходзе лесавывазак па Лесбелу на 21-VII-31 году

	Выканан. пляну па лесаматар'ялу		Процент выканан. па дровах	
	У проц. да задан.			
	Гадавое	Квартальнае	Гадавое	Квартальнае
Леспрамгасы:				
Бешанковіцкі	91,7	124,9	76,4	59,2
Віцебскі	91,9	43,8	100,2	21,1
Гарадоцкі	74,3	65,6	69,7	41,4
Гомельскі	31,2	62,5	54,1	14,7
Калінкавіцкі	70,8	42,2	34,8	4,8
Магілёўскі	81,3	115,1	72,6	19,0
Аршанскі	71,7	31,7	64,4	9,4
Асіпавіцкі	68,2	26,9	29,1	7,0
Быхаўскі	44,9	76,2	30,8	17,7
Клімавіцкі	54,1	35,0	50,0	19,2
Менскі	66,5	51,1	80,7	13,0
Полацкі	68,4	36,4	48,0	3,7
Слуцкі	50,5	16,7	12,21	100,1
Уборавіцкі	60,3	26,0	75,0	23,5
Чэрвеньскі	41,4	22,1	75,9	2,2

Забясьпечыць Васілеўскую лясную школу нармальнымі наборамі

Васілеўская лясная школа знаходзіцца пры ст. Васілевічы Заз. чых. Існуе школа з восені 1929 г. на базе 7-годкі. Школа падрыхтоўвае малодшы тэхнічны пэрсанал як для лясной гаспадаркі, так і для лесазагатовак галоўных парод: з ухілам на цьвёрда-лісьцяныя породы. Тэрмін навучаньня ў школе 2 гады. У сучасны момант школа ўжо мае 3 наборы. Слухачы школы бранируюцца Гомельскім дасьледчым інстытутам у якасьці сталых працаўнікоў інстытуту, сацыяльнае становішча якіх, а таксама здавальняючая адукацыя дасьць магчымасьць замяніць маючыйся ў Лесбеле баласт--маладымі чырвонымі спэцыялістамі!

Асеньні набор 1930 году мае 34 асобы, і зімовы набор 1931 г.—25 асоб. У сучасны момант усе вучні знаходзяцца на вытворчай практыцы у бліжэйшых Леспрамгасах. Практыка праходзіць па праграме школы пад кіраўніцтвам вопытных тэхнікаў лесвучастку і інструктароў школы. У часе правядзеньня практыкі вучні забясьпечваюцца пайком лясного рабочага і 54 р. у месяц. З 22-х месячнага тэрміну навучаньня—11 месяцаў вучні праводзяць працу непасрэдна на вытворчасьці.

Гэта дае перавагу на лепшае правядзеньне праграмы. Сацыяльнае становішча вучняў: больш 50 проц. калгасьнікаў ,беднякоў, рабочых і нязначная колькасьць маламоцных сераднякоў.

Адміністрацыя школы.

Лямешка наладжвае п'янкі, а лес засыхае на беразе

Пад носам у Рэчыцкага леспрамгасу на рэчцы засыхае 20.000 кубічных мэтраў драўніны, а дзесятнік на сплаву Лямешка кожны раз дае загады сплаўшчыкам закуліваць для папойкі гарэлку.

Рэчыцкі пракурор павінен прасачыць за гэтым злачынствам.

Пост-кар. сплаву Палушоў.

Дрыбінскіх кіраўнікоў лесазагатоўкамі, вывазкамі заядае правы апартунізм

Дрыбінскія арганізацыі, запутаўшыся ў ціне правага апартунізму, самацёку, падкаваўшыся думкаю ліквідацыі раёнаў, праваліли посьпех месячніка лесазагатовак і лесавывозак, ня гледзячы на тое, што былі ўсе магчымасьці для выкананьня пляну: рабгужсіла хапала, становішча шляхоў добрае.

Самацёк, бязьдзейнасьць, злачынная прымірэнцтва да зможна-кулацкае часьці насельніцтва саравалі выкананьню пляну. Вось что кажуць лічбы. Плян месячніка па лесазагатоўках выкананы усяго толькі на 24 проц., а па вытвацы на 32 проц. Асобныя сельсаветы літаральна бязьдзейнічаюць. Ждановіцкі сельсавет выканаў плян па лесазагатоўках усяго толькі на 5 проц. Суслаўскі сельсавет плян свой выканаў усяго толькі на 13 проц., Гаспадоўскі сельсавет—на 21 проц.

Характарыстыку работы паасобных сельсаветаў больш яскрава ўбачылі прывядзем некалькі канкрэтных фактаў. Карэбскі сельсавет па загатоўках выканаў заданьне—0, Дрыбінскі—0, Гарадоцкі—7 проц., Кароўчынскі—50 проц. і Чарняўскі выканаў свае заданьне па лесазагатоўках на 66 проц.

Вось малюнак таго, як выканалі сельсаветы заданьне па лесазагатоўках за час ударнага месячніка.

Па лесавывазках ва ўсіх пералічаных сельсаветах выкананьне заданьня не дасягае і 50 проц., калі браць нават пад увагу ўвесь гадовы плян.

Есьць паасобныя вёскі, якія грунтна замацавалі сябе на чорнай дошцы ня вывезшы ніводнага кубамэтра: вёска Рабкі, пасёлак Суслаўка, Залужжа, мястэчка Чарняўка, Ждановічы, Ценькавічы. Чарняўскі с.-с. (гэты сельсавет нават ня ведае хто ў яго мае цьвёрдае заданьне па лесавывазках).Ждановіцкі Краўчынскі ніякіх мер ня прымаюць да зрыўшчыкаў лесазагатовак і лесавывазак .

Райкалгассаюз ганебна праспаў у лесазагатоўчую кампанію. З 40 калгаў прымалі ўдзел толькі 8, а свае абавязацельствы цалкам выканалі толькі калгасы.

Аднак там ,дзе асобныя таварышы паддаліся ліквідацыйнаму настрою, і савывазка была задаволена посьпехам. Калгас **«Чырвоная Зьмена»** выканаў сваё абавязацельства на 153 проц., а калгас **«Майскае Утро»** выканаў сваё абавязацельства на 99 проц. Вёскі: хеєўка выканала свае заданьне на проц., Ладыжана—на 122 проц., «Новая Чарняўка»—на 99 проц., і вёска Ліны выканала свае заданьне на проц.

Назвы гэтых калгасаў і вёсак павінны быць занесены на чырвоную дошку, а арганізатары посьпеху Леспрамгасу павінны прэміравацца. Вінаўнікі-кіраўнікі кампаніі, страціўшыя клясавы чуцьцё, якія паддаліся самацёку і ліквідатарскім настроям, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Я. Х.

ПАПРАЎКА.

У пастанове СНК—«Пра рэалізацыю пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі» на вёсцы», зьмешчанай ў «Сав. Бел.» нумар 169, на другой старонцы, пункт 1 трэба чытаць у наступнай рэдакцыі:

«Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты пад асабістую адказнасьць старшынь, мабілізаваць усю грамадскасьць на правядзеньне кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы і асабліва сялянства індывідуальнага сэктару з тым, каб 1-га жніўня цалкам было выкананае заданьне».

У пастанове СНК БССР—«Пра бясьпечаньне апалам у 1931 г.», зьмешчанай у «Сав. Бел.», нумар 173, 4 старонцы з пункту 9 пасьля слова «даручыць» выпалі словы—«ВСНГ бясьпечыць».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКО

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР
Алошні паказ оперы пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава
Царская нявеста муз. Рымскага-Корсакова
Пачатак а 8 гадз. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 гадз.
У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк
Гастролі нямецкага ўкраіцеля лаці з яго групай бэрбэрыйскіх ЛЬВОЎ
Паветраны палёт Валэнціні
2 Сазановы 2 —з першом—
Тік—Так акробаты эксцэнтрыкі
Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары.
Льготныя білеты ў рабкасе

Кіно-тэатр Культура
З 27 ліпеня новы фільм **Станцыя Пупкі**
пачатак а 7 гадзіне

Кіно „Інтэрнацыянал"
БАБЫ РЯЗАНСКІЯ
Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „Пралетары"
2 сэрыі 18 част. у адзін сэанс **Стэнлей у нетрах Афрыкі**
Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"
Першы гукавы мастацкі фільм
Пуцёўка ў жыцьцё Драма ў 34 эпізодах

Менскі архітэктурны-будаўніўчы сельска-гаспадарчы тэхнікум
АБЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
Асобы, якія скончылі 7-мі годкі, прафшколы, будучы, курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, іншыя навучальныя ўстановы ня ніжэй сямігодкі, прымаюцца без іспытаў.
Узрост паступаючых ад 15—25 год. 65 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы прымаюцца да 1-га верасьня.
Умовы прыёму абвешчаны ў газэтах: „Зьвязда" і „Рабочий" за 4-VII—„Савецкая Беларусь" за 5-VII.
Заявы накіроўваюцца па адрасу: г. Менск, Савецкая вул № 113.
Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка
Калгасцэнтр БССР
Дырэкцыя тэхнікуму

Лужасьнянскі Дзяржаўны с.-г. лёнапяньковы тэхнікум
АБВЯШЧАЕ ПРЫЕМ ЗАЯЎ
у тэхнікум да 15-га верасьня г. г.
Усяго будзе прынята 90 асоб. Пры тэхнікуме маецца два аддзяленьні—пераапрацоўкі і культуры лёну і канапель. Тэхнікум з 3-хгадовым тэрмінам навучаньня, рыхтуе тэхнікаў па пераапрацоўцы і культуры лёну і канапель. Заняткі з прынятымі пачнуцца 1-га кастрычніка г. г. Тэрмін залічэньня з 15-га верасьня да 1-га кастрычніка. У тэхнікум прымаюцца асобы ад 16 да 30 год. Скончыўшыя поўны курс 9-годкі, 2 ступені, 2-хгадовыя адукацыйныя курсы, 7-годку, школы дарослых павышанага тыпу, школы калгаснай моладзі, курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум—бяз іспытаў, а па іспытах ня скончыўшыя вышэйпералічанае.
Да заявы неабходна прыкласьці дакументы:
1. Аб узросьце, 2. Аб адносінах да вайсковай павіннасьці, 3. Аб адукацыі, 4 Аб здароўі, 5. Аб сацыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў да і пасьля кастрычн. рэвал. і што паступаючы і бацька не пазбаўлены выбарч. правоў. 6. Для калгасьнікаў—даведку аб маёмасным становішчы да ўступленьня ў калгас і што зараз знаходзіцца ў калгасе, 7. Для сялян-адноасобнікаў акладны ліст па с.-г. падатку на 1930-31 г., 8. Анкету пасьведчаную сельсаветам або прафарганізацыямі, 9. Дзьве фотаграфічныя карткі і паштовых марак для адказу на 45 кап.
Інтэрнатамі будуць забясьпечаны на 100 проц., а стыпэндыяй, выходзячы з матар'яльнага і сацыяльнага становішча на 60 проц.
Заявы наніроўваць па адрасу: г. Віцебск, БССР, паштовае агенцтва Лужасно, с.-г. тэхнікум
Дырэктар тэхнікуму МАРОЗАЎ

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
Кніжныя навіны:
1. Працоўнае заканадаўства СССР і БССР, тыраж 3.000. у пер. Цана 6 р. 25 к.
2. Кодэкс аб працы БССР, тыр. 5.000. Цана 25 кап..
3. П. ЛАЗАРЭВІЧ. Прамысловая падсочка хвоі, тыраж 3.000. Цана 3 р. 75 кап.
4. Я. ТРАЙМОВІЧ. Гідротэхніка рыбнае справы, тыр. 3.000. Цана 2 р.
Продаж вытвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, Спажыўкаапэрацыі і Саюздруку.

ГАРАДОЦКІ ТЭХНІКУМ
МЭХАНІЗАЦЫІ С.-Г. (ТРАКТАРНЫ)
АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на 1-шы курс з 15-га ліпеня па 15-га верасьня
Да заявы трэба прыкласьці наступныя дакументы (у арыгіналах):
1. Анкету, засьвечаную прафсаюзам, райвыканкомам і іншымі савецкімі установамі, але ня ніжэй раённага маштабу.
2. Даведку аб сацыяльным і матар'яльным становішчы.
3. Аб праве голасу паступаючага і яго бацькоў.
4. Даведку аб стане здароўя.
5. Копію вайсковага дакументу для мужчын.
6. Дакумант аб адукацыі.
7. Мэтрычны выпіс.
8. 2 засьвечаныя фотаграфічныя карткі.
9. Для сялян копію акладнога ліста аб падатку на 1931-32 г.
10. Паштовых марак на 40 кап. для адказу.
Адукацыя для паступаючага ня ніжэй 7-мігодкі, узрост ад 17 год. У першую чаргу прымаюцца камандыраваныя з МТС. 55 проц. будуць забясьпечаны інтэрнатам і стыпэндыяй
Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка
ДЫРЭКЦЫЯ

РАГАЧЭЎСКАЯ БОНДАРНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-ы курс
У КОЛЬКАСЬЦІ 40 АСОБ
У школу прымаюцца асобы скончыўшыя 4-хгодку ва ўзросьце ад 15 год і звыш.
У першую чаргу прымаюцца дзеці рабочых, калгасьнікаў, гарадзкой і сельскай беднаты, служачыя і сераднякі.
Вучні забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры 20 руб. у м-ц.
Да заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы:
1. Даведка аб сацыяльным становішчы паступаючага і бацькоў, 2. Пасьведчаньне аб скончэньні 4-хгодкі, 3. Даведка аб стане здароўя, 4. Мэтрычны выпіс, 5. Даведка аб праве голасу. Да заявы неабходна прыкласьці 30 к. марку
Заявы прымаюцца да 15-га жніўня 1931 г. Па адрасу: г. Рагачэў, вуліца Лейтнера, 5-3.
Адміністрацыя школы

Аршанскі Тэхналёгічна-мясапрамысловы тэхнікум
— АБВЯШЧАЕ —
НОВЫ НАБОР
Дакументы прымаюцца канцылярыі тэхнікуму
Ворша, Ленінская вул., тэхнікум мясной прамысловасьці з 1-га жніўня на 15 верасьня. Патрэбна падаваць усе дакументы згодна даведкі ка НК і марак на 30 кап.
Дырэктар тэхнікуму ШЭЙНІН

Квіт. за № 17340 на суму 11 р. 70 к. выдан. прыёмшчыкам Лесбелу на Сашыкевіча А. Квіт. № 344 п.

Круглая пячатка Дубровенскай бочай амбуляторыі. Квіт. № 345 п.

Вайсковы білет, выданы Красн. РВК Смаленск. акр. Зах. вобл. на Цімашэнкава Фёдара. Квіт. № 346 п.

Членскі білет Працземлессаюзу Віцебінкаўск. Маскоўск. вобл. на імя Зыбнея Сямёна Яфімава. Квіт. № 346 п.

Дакумант, выдан. Ляднянскім пунктам на права забою каровы на імя Стэфанава Міхода Сьцяпанава. Квіт. № 346 п.

Вучотная конская нюжка № выд. Ляднянскім РВК на імя Арцёмова Сяргея. Квіт. № 346 п.

Пашпарт і вайскова-вучотная кніжка выдан. Ляднянскім РВК на імя Якулева Ягора Сяргеява. Квіт. № 346 п.

Членскі саюзны білет, выданы Ляднянскім саюзам саўгандльслужачых № 2138 на імя Міхаля Ўладзімера І